Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпаркі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпаркі наперад тэксту 1 р. — к. За радок пашпаркі перад тэкстам 1 р. 50 к. Абвесткі на 50 проц. дарожэй. Зьніжкі чарзе берацца 10 проц. штоту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 сап. За кожны дадатковы — 15 „ Бесспраўны і чырвонаармейцы за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 155 (2644) Серада, 10-га ліпеня 1929 г.

ПАН-ЭУРОПА.

Франка-амэрыканская барацьба навакол пытаньня аб даўгох абвастрэцца. Амэрыканскія ліхвяры рашуча залуляюць, — ніякіх гутарак аб адтэрмінаваньні, пакуль францускі ўрад не ратыфікуе, нарэшце, згоды аб выплаце ўсяго францускага доўгу, які дасягае разам з гэтым доўгам, 4 з лішкам міліярдаў даляраў. У францускіх парляманцкіх колах пануе вялікае ўзрушэньне. Фінансавая камісія палаты ўхваліла нязначнаю большасьцю рэзалюцыю, якая выказваецца за ратыфікацыю з агаворкамі, але гэта абсалютна немагчыма для Пуанкарэ, бо Злучаныя Штаты на такую ратыфікацыю ня згодзяцца.

Буржуазная-ж апазіцыя як крайняя правая, так і „левая" (радыкалы і сацыялісты), выказваюць сваю бутафарскую злосьць проці пагрознага ліхвяра—Злучаных Штатаў і абвінавачваюць урад у недапушчальнай падатлівасьці. Гэтымі дэмагагічнымі маневрамі „левыя" буржуазныя палітыкі, узрушаныя прыходам да ўлады Макдональда, спадзяюцца выклікаць урадавы крызіс і ізноў вярнуцца да ўлады.

Франка-амэрыканскі канфлікт заслугоўвае асаблівае ўвагі, бо ён зьяўляецца вельмі паказальным для агульных узаемаадносін Злучаных Штатаў і Эўропы. На старонках францускага радыкальнага друку пагрозна загучэў рэакцыйна-утапічны лёзунг—за аб'яднаную буржуазную „пан-Эўропу". „Падзявольная залежнасьць (ад амэрыканскага капіталу) ці эўрапейская федэрацыя" — пад гэтым загалоўкам адзін з лідэраў радыкалаў Дэмарґ'е зьмяшчае артыкул у „Рэспублік". Праэкт гэты ня новы. У Францыі часта ўсплывае плян згоды з Нямеччынаю і заснаваньня пад францускай гегемоніяй эўрапейскага блёку, накіраванага: з аднаго боку, проці Злучаных Штатаў, а з другога—проці СССР.

Разам з радыкаламі і сацыялістамі выступаюць некаторыя прадстаўнікі францускіх дзелавых колаў. Зьезд 500 старшыняў гандлёвых палат, які адбыўся ў палове чэрвеня, ухваліў вострую антыамэрыканскую рэзалюцыю, у якой прапануе, каб эўрапейскія краіны, эканамічная будучыня якіх пастаўлена пад пагрозу мытнае палітыкі Злучаных Штатаў, неадкладна прышлі да згоды наконт абарончых захадаў.

Пашырэньне падобных настрояў, накіраваных проці сусьветнага ліхвяра, які адначасна хоча зрабіцца сусьветным пастаўшчыком, мы бачым таксама і ў Нямеччыне. Усе гэтыя камбінацыі адбіваюць, з аднаго боку, шпаркае абвастрэньне барацьбы між Злучанымі Штатамі і Эўропаю, а з другога — спробы заснаваць антысавецкі блёк. Яны таксама павінны быць адзначаны як новая спроба буржуазных дыпляматаў і сацыял-дэмакратычных лёкаяў абдурыць працоўныя масы гутаркамі аб ліквідацыі канфліктаў між эўрапейскімі дзяржавамі, устанаўленьні моцнага агульнаэўрапейскага міру і г. д.

Узмоцненую ўвагу трэба зьвярнуць на той бок гэтага пляну, які накіравана проці краіны пралетарскае дыктатуры, а таксама проці калёніяльных і паўкалёніяльных народаў. Аднак, на шляху вырашэньня гэтых пляноў ляжаць вялікія эканамічныя і палітычныя супярэчнасьці між самымі імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Як там ні было-б, але пралетарыят СССР, які ў самых цяжкіх умовах абараніў сваю пралетарскую дзяржаву ад безьлічы імпэрыялістычных драпежнікаў, улічвае ўсе пагражаючыя яму небясьпекі. Пад кіраўніцтвам УсеКП(б) ён з яшчэ большым уздымам, з яшчэ большым напружаньнем сваіх сіл будзе падводзіць шырокую індустрыяльную аснову пад абароназдольнасьць сваёй пралетарскай дзяржавы. У шчыльным братэрскім саюзе з пралетарыямі і прыгнечанымі масамі ўсяго сьвету ён будзе адказваць за Савецкі Саюз, адначасна будуючы з яго непадступную крэпасьць сусьветнае рэвалюцыі.

„Правда".

Франка-амэрыканскі канфлікт.

Францускія „левыя" прыцца да ўлады.

ПАРЫЖ, 8-7. Спрэчкі між ворагамі прыхільнікамі ратыфікацыі згоды Мэлён-Бэранжэ групаваліся на пытаньні аб спыненьні акупацыі Рэйнскае вобласьці, бо радыкалы і сацыялісты залуляюць, што згодзяцца галасаваць за ратыфікацыю толькі ў тым выпадку, калі „будзе зьменены агульны характар замежнае палітыкі Францыі", між іншым, калі ўрад абавязацца неадкладна спыніць акупацыю Рэйнскае вобласьці.

Рашучая заява Гэндэрсона на карысьць спыненьня акупацыі абвострыла гэтыя спрэчкі. Правы друк падкрэсьлівае супярэчнасьці між францускай і ангельскай палітыкай у пытаньні аб Рэйскай вобласьці, прычым востра крытыкуе пазіцыю ангельскага ўраду. Левабуржуазны друк "адабрае заяву Гэндэрсона і кажа, што сучасная палітыка францускага ўраду ў даным пытаньні выкліча поўную ізаляцыю Францыі.

* * *

ПАРЫЖ, 8-7. Водлуг газэтных вестак, францускі ўрад будзе дамагацца, каб «праца рэпарацыйнай канфэрэнцыі была падзелена на 3 сэсіі».

Сацыял-фашысты супакойваюць буржуазею.

ПАРЫЖ. У „Тан" зьмешчана гутарка з Брэйтшэйдам (адзін з лідэраў нямецкае сацыял-дэмакратыі), у якой Брэйтшэйд заяўляе, што прыняцьце пляну Юнга павінна выклікаць за сабою «ліквідацыю ўсіх перажытых хваляваньняў», і між іншым, датэрміновае далучэньне Саарскай вобласьці да Нямеччыны.

Адначасна Брэйтшэйд „супакойвае францускую грамадзкую думку" і заяўляе, што хоць закон аб абароне рэспублікі не прайшоў, але нямецкі ўрад „не застанецца безабаронны проці мяцежнікаў, якія хацелі-б пасягнуць на сучасны лад".

Абмяркоўваючы заяву Брэйтшэйда, „Тан" падкрэсьлівае, што з францускага пункту гледжаньня пытаньне аб Саарскай вобласьці ні ў якім разе ня можа быць узьнята на надыходзячай рэпарацыйнай канфэрэнцыі.

Ваенная змова ў Румыніі.

ВЕНА, 8-7. Водлуг паведамленьняў з Бухарэсту, у Румыніі выкрыта ваенная змова, якая мела на мэце скінуць урад нацыянальна-сялянскае партыі і абвясьціць ваенную дыктатуру. Удзельнікі змовы мелі намер захапіць урадавыя ўстановы і арыштаваць усіх міністраў. У зьвязку з выкрыцьцём змовы арыштавана каля 200 афіцэраў. Сярод арыштаваных генэрал-інспэктар арміі Браджэану.

Гувэр не сьпяшаецца.

ЛЁНДАН. 8-7. Нью-Ёрскі карэспандэнт «Абсэрвэр» піша, што амэрыканскі прэзыдэнт Гувэр ня вельмі сьпяшаецца склікаць канфэрэнцыю аб марскім разброеньні. Гувэр спадзяецца, што да спатканьня марскіх экспэртаў па гэтым пытаньні адбудзецца канфэрэнцыя дзяржаўных дзеячоў. Амэрыка выказваецца за ўдзел у гэтай канфэрэнцыі міністраў замежных спраў Англіі, Францыі, Японіі і Італіі.

ТРЭЦЯЯ ПАРТЫЯ АНГЕЛЬСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ НА ЧАЛЕ ЎЛАДЫ

Лёкаяў абяцаюць падтрымліваць.

ЛЁНДАН, 8-7. Характарызуючы дзейнасьць Макдональда, рэакцыйная «Дэйлі Мэйль» піша: „Хоць некаторыя дзеяньні ўраду не даюць магчымасьці выказаць яму поўнае адабраньне, нельга, аднак, зазначыць на які-небудзь яго крок, які заслугоўваў-бы суровае ганьбы". Далей газэта пахваляе міністра ўнутраных спраў Клійнса за яго адмову даць амністыю капальнікам, засуджаным у 1926 годзе ў Крэмленгтопе за «ўдзел» ва ўсеагульнай забастоўцы.

Апроч таго, газэта адабрае палітыку Гэндэрсона ў пытаньні аб аднаўленьні зносін з СССР. Газэта кажа пры гэтым: „Калі ўрад будзе і надалей праводзіць такую мудрую і цьвёрдую палітыку, дык ён можа быць прыемна зьдзіўлен, спаткаўшы шырокае падтрыманьне".

Цьвёрдалобыя задаволены троннай прамовай.

ЛЁНДАН, 8-7. „Сэндэй Таймс" у перадавіцы заяўляе, што прамова міністра замежных спраў Гэндэрсона ў спрэчках па адказе на троную прамову сьведчыць аб тым, што ўрад рабочай партыі можа зьмяніць падход да вонкава-палітычных пытаньняў, аднак, ён ня зьменіць прынцыпу „перайманьня ад сваіх папярэднікаў палітыкі ва ўсіх жыцьцёвых пытаньнях". Такія паводзіны, бясспрэчна, забясьпечаць ураду ўсеагульную ўдзячнасьць. Больш таго, выразна відаць, што ўрад намеран праводзіць сваю замежную палітыку, як імпэрскую палітыку.

Нямеччыну абнадзейваюць.

ЛЁНДАН, 8-7. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: „Адказваючы ў палаце вобмічыя на зададзенае яму запытаньне Гэндэрсон за явіў, што ангельскі ўрад спадзяецца на тое, што акупацыя Рэйнскае вобласьці будзе спынена ў самай бліжкай будучыне; урад спачуваў-бы, калі-б спыненьне акупацыі адбывалася паступова (г. зн. па асобных зонах).

Урад імкнецца да супрацоўніцтва з францускімі і бэльгійскімі ўрадамі для таго, каб спыненьне акупацыі было зроблена разам і праведзена поўнасьцю. Ангельскі ўрад выкажацца за тое, каб тэрмін спыненьня акупацыі быў устаноўлены на надыходзячай палітычнай рэпарацыйнай канфэрэнцыі".

Рэзкае абвастрэньне клясавых супярэчнасьцяй.

ГЭРАІЧНАЯ БАРАЦЬБА ТРАМВАЙНЫХ РАБОЧЫХ.

НЬЮ-ЁРК, 8-7. Забастоўка трамвайных рабочых у Нью-Арлеане цягнецца ўжо 6 ты дзень. Бастуючым удалося перашкодзіць усім спробам прадпрыемцаў аднавіць трамвайны рух пры дапамозе штрэйкбрэхераў. Між бастуючымі і спачуваючымі ім рабочымі, з аднаго боку, і паліцыяй, з другога, здарылася некалькі сутычак. Паліцыя пусьціла ў ход гумовыя кіі і сьлёзныя газы, а таксама страляла ў бастуючых. Двое бастуючых забіта, шмат паранена. Бастуючыя спалілі некалькі трамвайных вагонаў і ў некаторых мясцох зруйнавалі трамвайную калёіну.

Шмат паліцэйскіх адмовіліся выступаць проці бастуючых. Нью-арлеанскія прафсаюзы награжаюць забастоўкаю спачуваньня. Прывезеныя з іншых гарадоў штрэйкбрэхеры прымушаны застацца за горадам, бо мясцовая ўлада ня можа гарантаваць ім безапаснасьці. Мясцовая ўлада, баючыся паўтарэньня сутычак, прапануе прадпрыемцам ня ўжываць пакуль-што нілкіх захадаў да аднаўленьня трамвайнага руху. Учора бастуючыя трамвайшчыкі наладзілі дэманстрацыю па галоўных вуліцах гораду.

15 тэкстыльшчыкаў засуджаны на кару сьмерці.

НЬЮ-ЁРК, 8-7. Камуністычная партыя Злучаных Штатаў падрыхтоўвае масавую кампанію за выратаваньне 15-ці бастуючых тэкстыльшчыкаў, арыштаваных у Гастоніі (Паўночная Караліна) і абвінавачаных у забойстве начальніка паліцыі (начальнік паліцыі Гастоніі быў забіты ў часе наскоку паліцыі на лягерны гарадок бастуючых тэкстыльшчыкаў). УСЕ 15 БАСТУЮЧЫХ ЗАСУДЖАНЫ ДА КАРЫ СЬМЕРЦІ. Ва ўсёй краіне наладжваюцца масавыя мітынгі пратэсту.

Правакацыя паліцыі. Масавыя арышты.

ВЕНА, 8-7. Водлуг паведамленьняў з Сафіі, аўтамабіль, у якім ехалі вышэйшыя баўгарскія чыноўнікі з Крычан у Плаўдзіў, абстраляны невядомымі асобамі. Адзін з паліцэйскіх агентаў, які ехаў з чыноўнікамі, забіт. Паліцыя заяўляе, што страляўшыя хацелі забіць прэм'ера Ляпчава. Ляпчаў прасхаў па тым самым шляху на гадзіну раней. У зьвязку з замахам паліцыя ўчыніла ў ваколічных сельскіх мясцовасьцях шматлікія арышты сярод прыхільнікаў сялянскага саюзу. Дзеячы сялянскага саюзу заявяраюць, што замах інсцэніраваны ўладаю, каб стварыць прычыну для ўзмацненьня рэпрэсій.

Блёк фашыстаў з сацыял-дэмакратамі.

ВЕНА, 8-7. Водлуг паведамленьня з Будапэшту, вэнгерскі прэм'ер Бэтлен праводзіў перамовы з сацыял-дэмакратамі аб супрацоўніцтве між урадам і сацыял-дэмакратычнай фракцыяй парляманту. У левых рабочых колах падкрэсьліваюць, што сацыял-дэмакраты ўжо ня першы раз пачынаюць такія перамовы з фашыскім урадам. Першы раз (2 гады назад) перамовы скончыліся нічым, бо яны выклікалі вялікае абурэньне сярод радавых сяброў сацыял-дэмакратычнае партыі. Не зважаючы на гэта, лідэры вэнгерскае сацыял-дэмакратыі намераны зараз, як відаць, утварыць згоду з урадам.

Забастоўка докераў.

ПАРЫЖ, 7-7. У Лісабоне і Лясэйне докеры абвясьцілі забастоўку з прычыны таго, што прадпрыемцы зьнізілі заработак з 34-х франкаў да 30-ці франкаў за дзень.

Рэфармісты выключаюць з саюзаў рабочых

БЭРЛІН, 8-7. Выканком агульнанямецкага саюзу мэталёўцаў выключыў з саюзу выдатнага працаўніка сэцыі токараў Бальса, які належыць да левага рэвалюцыйнага крыла. Афіцыйнаю прычынаю да выключэньня было выгутуленьне Бальса на адным з берлінскіх мэталёўпрамысловых прадпрыемстваў на карысьць забастоўкі, абвешчанай, не зважаючы на забарону прафсаюзных органаў.

Падрыхтоўка да кангрэсу працоўнага сялянства.

БЭРЛІН. 4-7. Учора адбылося ў Берліне пасяджэньне камітэту па падрыхтоўцы агульна-эўрапейскага кангрэсу працоўнага сялянства. У пасяджэньні ўзялі ўдзел дэлегаты ад сялян большасьці эўрапейскіх краін. Камітэт склікае кангрэс працоўнага сялянства ў студзені 1930 году, арганізаваўшы яго такім чынам, каб на ім прысутнічалі не правадыры, а сапраўдныя дэлегаты ад працоўнага сялянства.

Забастоўка на джутавай фабрыцы.

ЛЁНДАН, 8-7. 2 тысячы рабочых джутавае фабрыкі абвясьцілі забастоўку ў зьвязку з нежаданьнем прадпрыемцаў аплачваць звышвурчныя за працу.

Дэманстрацыя будаўнікоў.

ПАРЫЖ, 2-7. У Руане адбылася дэманстрацыя будаўнічых рабочых, якія пратэставалі супроць адмовы прадпрыемцаў павялічыць заработак.

Выкрыцьцё новых машынстваў фабрыкантаў фальшывак

АРЛОУ ДАСТАЎЛЯЎ ВАЙСКОВАМУ МІНІСТЭРСТВУ ІНФАРМАЦЫЮ.

БЭРЛІН, 8-VII. Увесь нямецкі друк устанаўляе, што папярэднія выпікі судовых пасяджэньняў, якія адбыліся на справе банды Арлова, кажуць аб сувязі дзяржаўных устаноў са шпіёнамі і фабрыкантамі фальшывак. Увесь друк падкрэсьлівае, што гэтая сувязь зараз дакументальна ўстаноўлена і занатавана судовым пратаколам і загэтым друк катэгарычна патрабуе неадкладна спыніць гэтую сувязь.

Ульштэйнаўская газэта „Монтаг Пост" сёньня зьмяшчае сэнсацыйныя паведамленьні аб новых машэньніцкіх учынках банды Арлова ў адносінах да вайсковага міністэрства і міністэрства замежных спраў. Падрабязнасьці афэры наступныя: вядомы Краўкоў паведаміў Паўлаўскаму, што ён можа прадаць міністэрству замежных спраў кнігу шыфраў аднэй чужаземнай дзяржавы. Палітычнай паліцыі ўдалося яшчэ да продажу захапіць гэтую кнігу і аказалася, што яна зьяўляецца грубым падробам, зробленым у аднэй з берлінскіх друкарняў. Аднак, Арлову ўдалося прадаць другі адбітак гэтае кнігі прадстаўніку іншай дзяржавы.

Яшчэ горш стаіць справа з афэраю Арлова ў вайсковым міністэрстве, паколькі гэтае міністэрства пасьпела ўжо аплаціць агентам Арлова поўную суму. Справа ідзе аб інфармацыі, якую Арлоў і Паўлаўскі з 1922 г. дастаўлялі вайсковаму міністэрству праз інфармацыйнае бюро «Нунцыя». На чале гэтага бюро былі 2 былыя нямецкія афіцэры, якія служылі пасьля сусьветнай вайны ў Скарападзкага і змагаліся проці СССР, а іменна: майёр Шлізэр і штабс-капітан Рау.

ПРЫЯЦЭЛЬСКІЯ ДАЧЫНЕНЬНІ АРЛОВА З ЦЭРГІБЭЛЕМ.

БЭРЛІН, 8-7. «Ротэ Фанэ» зьмяшчае факсіміле аднаго з лістоў Арлова, які піша, што ён быў выслан з Нямеччыны, бо нямецкая ўлада ацаніла яго дзейнасьць. Газэта падкрэсьлівае, што „ўладаю", ад якое залежала вырашэньне пытаньня аб высылцы Арлова, зьяўляюцца два сацыял-дэмакраты—прускі міністр унутраных спраў Грэзінскі і берлінскі паліцэй-прэзыдэнт Цэргібель.

З гэтага-ж лісту відаць, што Арлоў складаў шматлікія фальшыўкі для майёра Рау, які знаходзіцца на чале інфармацыйнага бюро, якое атрымлівае, водлуг слоў „Ротэ Фанэ", субсідыі з міністэрства ўнутраных спраў і вайсковага міністэрства.

Яшчэ адзін фабрыкант фальшывак.

ВЕНА, 7-7. Водлуг паведамленьняў з Бухарэсту, румынская паліцыя арыштавала гэтымі днямі купца Гольда—галаву фабрыкі «дыпляматычных» фальшывак. Гольд рабіў таксама і антысавецкія фальшыўкі. Так, у свой час быў зроблен „даклад савецкага паўнамоцнага прадстаўніка ў Вене", які павінен быў даказаць сувязь «нацыянальна-сялянскай партыі з савецкім урадам». Гэтую фальшыўку Гольд прадаў румынскаму ўраду лібаралаў за 200 тысяч франкаў. Супольнік Гольда нейкі Разэску-Пітон, які паведаміў праз бухарэсцкі друк аб фальшывасьці «дакументаў», быў засуджаны на 8 гадоў астрогу.

СУСЬВЕТНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТ—НА ВУЛІЦУ 1-га ЖНІЎНЯ.

Рабочыя рыхтуюцца да 1-га жніўня.

БЭРЛІН, 8-7. На працягу апошніх дзён у Берлінскім райёне і ў Рурскай вобласьці на некаторых прадпрыемствах адбыліся рабочыя сходы, прысьвечаныя пытаньню аб падрыхтоўцы і праведзеньні дню 1-га жніўня. Усюды на сходах былі абраны камітэты барацьбы проці імпэрыялістычнае вайны. Такія сходы адбываюцца зараз па ўсёй Нямеччыне.

ПАРЫЖ, 7-7. У Парыжы адбыўся шматлікі мітынг чыгуначнікаў, окліканы унітарным прафсаюзам. Мітынг ва ўхваленай рэзалюцыі заявіў, што чыгуначнікі на спыняць барацьбы за павалічэньне заработку, ужываючы ўсе спосабы барацьбы, параджаныя 4-м кангрэсам Прафінтэрну.

Адначасова рэзалюцыя заклікае ўзяць удзел у падрыхтоўцы і праведзеньні дню 1-га жніўня.

Пры гэтым рэзалюцыя падкрэсьлівае неабходнасьць барацьбы проці міжнароднай сацыял-дэмакратыі і Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу, якія служаць выключна інтарэсам капіталу.

Пралетарыі Парыжу—да 1 жніўня.

ПАРЫЖ, 7-7. На ўсіх прадпрыемствах Парыскага райёну рабочыя дзёйна рыхтуюцца да праведзеньня міжнароднага чырвонага дню 1-га жніўня, усюды на сходах ухваляюцца рэзалюцыі аб удзеле і дэманстрацыях пад лёзунгамі барацьбы проці імпэрыялістычнае вайны і ў абарону СССР.

Пахаваньне рэвалюцыянэра

ВЫЛІЛАСЯ Ў МАГУТНУЮ РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ.

ПАРЫЖ, 8-7. Адбылося пахаваньне вэтэрана францускага рэвалюцыйнага руху т. Фана Колі, які быў на працягу 30-ці гадоў гласным парыскае гарадзкое думы. Пахаваньне абярнулася ў вялікую рабочую маніфэстацыю з удзелам больш 12 тысяч працоўных Парыскага райёну. Працэсія з чырвонымі сьцягамі накіравалася на могілкі Пэр-Ля-Шэз, дзе было спалена цела.

Камуністычныя дэпутаты Гаршры і Кашэн у прамовах спынілася на рэвалюцыйнай дзейнасьці нябожчыка. Прамоўцы зазначылі, што француская кампартыя і рэвалюцыйны пралетарыят трацяць у асобе Колі загартаванага і адданага барацьбіта, усё жыцьцё якога было прысьвечана абароне інтарэсаў рабочых і рэвалюцыйнай барацьбе. Колі—у юнацкія гады гарняк, пасьля чыгуначнік,—усё сваё жыцьцё змагаўся з капіталам, за гэта ён цярпеў розныя рэпрэсіі. У 1896 г. ён быў абраны парыскімі рабочымі гарадзкім гласным і з невялікім перапынкам заставаўся на гэтай працы да самай сьмерці. Пасьля прамовы Кашэна жалобная працэсія са сьпевам «Інтэрнацыяналу» і з выгукамі „Няхай жыве камуна" накіравалася ў Пэр-Ля-Шэз.

Афіцыйныя дэлегацыі муніцыпальнай рады Парыжу і дэпартаманцкае рады на чале з прэфэктам дэпартаманту Шэн Рэмэрам, якія занялі першае месца за труною, павінны былі саступіць месца рабочым дэлегацыям, у зьвязку з чым яны пакінулі працэсію і ішлі побач з працэсіяй да самага ўваходу на могілкі. Тут, выказаўшы спачуваньне жонцы нябожчыка, дэлегацыя заявіла, што яна адмаўляецца гаварыць прамовы над труною ў зьвязку з тым, што камуністы надалі пахаваньню рэвалюцыйны характар.

Адзначаючы гэты інцыдэнт, буржуазны друк паведамляе, што гэтае здарэньне будзе тэмаю абмеркаваньня ў муніцыпальнай радзе.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Працоўныя Грузіі вітаюць ЦВК СССР.

ТЫФЛІС, 9-7. У чэсьць 6-х угодак заснаваньня ССР 6-ты зьезд бальшавікоў Грузіі ад імя рабочае клясы і ўсіх працоўных Грузіі зьвярнуўся з такім братэрскім камуністычным прывітаньнем да ЦВК СССР: „Вызваленыя Кастрычнікавай рэвалюцыяй ад прыгнечаньня царызму мілёны працоўных усіх нацыянальнасьцяй былое царскае Расеі маюць магчымасьць будаваць пановаму сваё жыцьцё, узмацняць і пашыраць народную гаспадарку, будаваць новую культуру—нацыянальную на форме і пралетарскую па зьместу.

Пад кіраўніцтвам кампартыі працоўных усіх нацыянальнасьцяй Саюзу, выкарчоўваючы карэньні капіталізму, ажыцьцяўляючы рашучую барацьбу з эксплёататарскай і кулацка-дзяр[illegible] бэкскімі элемэнтамі, рашуча перамагаючы ўсе цяжкасьці, якія стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва нашае краіны, пойдуць да новых перамог".

Пашыраецца сацыялістычнае спаборніцтва

АРЦЁМАЎСК, 8-VII. Дзень канстытуцыі СССР 7 ліпеня адзначан надпісаньнем у Гарлоўцы ўседанецкага сацыялістычнага дагавору. Дагавор прадугледжвае значнае павялічэньне прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліны, пашырэньне мэханізацыі, налепшаньне якасьці і патаненьне вугалю. Заданьне па здобычу вугалю гарнякі Данбасу абавязуюцца сёлета выканаць з перавялічэньнем на 3 проц.

Культпрацаўнікі абавязуюцца да 1 мая 1930 году поўнасьцю зьнішчыць пісьменнасьць сярод гарнякоў. Інжынэры і тэхнікі ўзялі на сябе абавязак заснаваць брыгады спэцыялістаў для правядзеньня гутарак і лекцый па тэхніцы.

Ад імя 200 тысяч рабочых камэнавугольнай прамысловасьці Данбасу пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)У, рэдакцыі «Праўды» і пленуму ЦК саюзу горнарабочых. У падарунак пленуму рабочыя ўсіх рудніковых акругі адпрацавалі нядзельнік за звычайную, а не падвойную плату.

Пад кантроль выкананьне пастаноў.

МАСКВА, 8-VII. На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і калегіі НК РСІ СССР ухвалена, каб кожны Наркамат і цэнтральная ўстанова наладзілі ў сваім апараце сыстэматычны кантроль за выкананьнем заданьняў 16-й партканфэрэнцыі і 5-га Зьезду Саветаў СССР.

Усім рэспублікам, краявым і абласным КК РСІ прапануецца ўстанавіць такі-ж парадак праверкі выкананьня пастаноў 16-й партканфэрэнцыі і 5-га Зьезду Саветаў СССР, а таксама мясцовых партканфэрэнцый і Зьездаў Саветаў.

Нядзельнік у фонд індустрыялізацыі.

МІКАЛАЕЎ, 8-7. Учора адбыўся першы на Украіне нядзельнік, выпрацоўка ад якога пойдзе ў фонд індустрыялізацыі краіны. У нядзельніку ўзялі ўдзел рабочыя ўсіх прадпрыемстваў. Нядзельнік прайшоў з вялікім уздымам. На нядзельнік зьвяліся нават некаторыя рабочыя, якія зараз знаходзяцца ў водпуску. На заводзе імя Марты яўка дасягнула 100 проц. Продукцыя нядзельніка перавялічыла звычайную дзённую в. працоўну.

Дзень піянэраў з чырвонаармейцамі.

МАСКВА, 8-VII. Цэнтральны штаб зьлёту юных піянэраў ухваліў правесьці 25-га жніўня пад кіраўніцтвам Равалюцыйнага Вайсковага Савету СССР вайсковы дзень піянэраў з чырвонаармейцамі. Штаб заслухаў даклад аб кальцавым паходзе піянэраў Замаскварэцкага лягеру заводу „Красный Пролетарий". Гэтыя піянэры абыйшлі шмат вёсак Маскоўскае губэрні. Усюды яны гулялі з дзецьмі, а пасьля праводзілі сходы і апавядалі пра зьлёт. Піянэры былі спатканы сялянамі вельмі прыхільна. Штаб прыняў вопыт Замаскварэцкага лягеру вельмі каштоўным і раіць усім гарадзкім арганізацыям піянэраў практыкаваць такія ж паходы ў вёску на дапамогу мясцовым зьлётам.

Кругавы пералёт авіёбрыгад.

МАСКВА, 8-VII. Вялікі кругавы пералёт камандзіраў авіёбрыгад праходзіць з вялікім посьпехам. 7-га ліпеня 3 самалёты зрабілі ўсходняе кола пералёту. Заходняе кола пералёту ў нядзелю скончыў камбрыг тав. Васільчанка на самалёце „Рабочий Замоскворечья". 8-га ліпеня а 14-й гадз. тав. Асадчы і тав. Гарбуноў на самалёце „Цэнтрасаюз СССР" прыляцелі ў Маскву першымі, скончыўшы вялікі кругавы пералёт камандзіраў авіёбрыгад. Яны прабылі на паветры каля 35-ці гадзін і ляцелі з сярэдняю хуткасьцю больш 150 кілёмэтраў у гадзіну. Пералёт зроблен на самалёце і маторы савецкае канструкцыі і савецкага вырабу. Усе самалёты і маторы знаходзяцца ў вельмі добрым становішчы.

Пабудуем новыя электрастанцыі.

МАСКВА. На ўсесаюзнай канфэрэнцыі загадчыкаў сельскімі электрастанцыямі быў заслуган даклад Галоўэлектры аб перспэктывах сельскага электрабудаўніцтва. Згодна пяцігадовага пляну мяркуецца давесьці сетку электрафікацыі з 1137 у 1928-29 годзе да 2000 у 1932-33 годзе, г. зн. амаль што падвоіць. Агульная магутнасьць усіх электрастанцый дасягне да канца пяцігодкі 260.000 кілёват.

НА АБАРОНУ КРАІНЫ.

МАСКВА. 7-га ліпеня на цэнтральным маскоўскім аэрадроме адбылася перадача вайсковаму паветранаму флёту Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі чатырох самалётаў, пабудаваных на дабраахвотныя ахвяраваньні працоўных: „Красный Аповец", „Коммунар", „Красная Пресня" і «Москожпромсоюз».

ВЫПАЎНІЛІ ПЛЯН З ПЕРАВЫШЭНЬНЕМ.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 9-7. Аб'яднаныя мэталюргічныя заводы імя Пятроўскага і Леніна скончылі 3-ці квартал з перавялічэньнем пляну вытворчасьці амаль што па ўсіх цэхах. Па выплаўцы чыгуну выканана 100 проц. заданьня.

Старт самалёту „Крылья Советов".

МАСКВА, 8-7. 10-га ліпеня а 3-й гадз. раніцы на цэнтральным маскоўскім аэрадроме будзе дадзен старт самалёту „Крылья Советов", які выляціць заграніцу.

Савгас—на дапамогу беднаце.

АДЭСА, 8-7. Пасьля 42-дзённай працы трактараў саман буйная на Украіне збожжафабрыка імя Пятроўскага ўзарала пад пар у Адэскім і Мікалаеўскім раёнах абшар у 16 тысяч гэктараў. Савгас даў вялікую дапамогу ваколічнаму бяднацкаму сялянству і калгасам, узяўшы на іх землях 700 гэктараў пару. Стан ярыны ў савгасе вельмі добры.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

АПРАЎДАНЬНЕ АЎТАНАМІСТА.

ПАРЫЖ, 8-7. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Крымінальны суд апраўдаў аўтанаміста Бэнуа, які ўчыніў замах на жыцьцё пракурора Фашо, які выступаў абвінавайцам на фэльмарскім працэсе.

УЦЕКАЧЫ З АЎГАНІСТАНУ.

ТЭГЕРАН, 8-7. Друк паведамляе аб надыходзячым прыезьдзе ў Пэрсію Інаятулы-хана (брат Аманулы-хана) і зазначае, што ў апошні час з Аўганістану ўцякло ў Пэрсію шмат ранейшых міністраў і вайсковых дзеячоў.

«ВІЗЫТ» ЛАТВІЙСКАГА ВАЙСКОВАГА ФЛЁТУ.

РЫГА, 6-7. Латвійскі вайсковы флёт у складзе 3 суднаў накіраваўся „з візытам" у польскі порт Гдыню. Гэты візыт зьвяўляецца адказам на наведаньне Латвіі польскімі вайсковымі суднамі летась.

Генэралы адлажылі падарожжа.

ПЭЙПІН, 8-7. Сюды прыехаў Чжан-Сюэ-Лян. Адбылася нарада між Чан-Кай-Шы і Чжан-Сэю-Лянам. Пасьля нарады з Чан-Кай-Шы Ен-Сі-Шан паведаміў прадстаўнікам кітайскага друку, што ён адклаў сваё падарожжа заграніцу разам з Фынь-Юй-Санам.

Урад трудавікоў у Эстоніі.

РЭВЭЛЬ. Старшыня парляменту Эйнбунд (аграрый) даручыў складаньне ўраду лідэру трудавікоў Штраўсману.

Рост уплыву кампартыі.

ГЕЛЬСІНГФОРС, 8-VII. Водлуг вестак надасланых да гэтага часу аб выборах у сойм, камуністы выйгралі 2 мандаты.

Пробны камень.

ЛЁНДАН, 8-7. Кансэрватыўная „Дэйлі Экспрэс" піша, што пытаньне аб беспрацоўі зьявіцца пробным камэнем для ўраду Макдональда.

Адзначэньне дню каапэрацыі.

БЭРЛІН, 8-7. У міжнародны дзень каапэрацыі адбыліся 4 масавыя мітынгі, скліканыя кампартыяй.

Разгляд справы „Таварыша" і „Алькантара".

МАСКВА, 8-7. У Лёндане распачаўся разгляд справы аб сутычцы парусьніка „Таварыш" з італьянскім параходам „Алькантар".

Аварыя францускага самалёту.

ПАРЫЖ, 7-7. У Ангулеме самалёт, які прыляцеў з Цэйкьлі, пацярпеў аварыю. Лётнік, капітан Кудур'е, забіт.

ПРАВЕРКА І ЧЫСТКА ПАРТЫІ.

ПРАВЕРАЧНАЯ КАМІСІЯ САМАХВАЛАВІЦКАГА РАЙЁНУ ПРЫ ДАПАМОЗЕ ПРАЦОЎНЫХ ВЫКРЫЛА ГНОЙНІК У ФАНІПОЛЬСКАЙ ЯЧЭЙЦЫ.—ПРАВЕРАЧНЫЯ КАМІСІІ РАЗГОРТВАЮЦЬ САМАКРЫТЫКУ, ВЫЯЎЛЯЮЦЬ ХІБЫ І ДАЮЦЬ НАПРАМАК У ДАЛЕЙШАЙ ПРАЦЫ.—ДА ЧЫСТКІ НЯ ЎСЮДЫ ПАДРЫХТАВАНЫ.—ЯШЧЭ РАЗ ПРАВЕРЫМ ПАДРЫХТОЎКУ, УВЯЖАМ ПРАВЕРКУ І ЧЫСТКУ З ВЫРБОЎКАЙ ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ, БАТРАКОЎ І БЕДНЯКОЎ У ПАРТЫЮ.

НЕКАТОРЫЯ ВЫНІКІ ПРАВЕРКІ І ЧЫСТКІ.

8-га ліпеня адбылося пасяджэньне ЦКК КП(б)Б, на якім заслухоўваліся даклады старшыні Менскай АКК тав. Дамброўскага і Віцебскай т. Мундава як праходзіць праверка і чыстка па гэтых арганізацыях.

Па Менскай партарганізацыі.

Падрыхтоўка.

Адразу пасьля XVI партканфэрэнцыі Менская арганізацыя ўзмацніла падрыхтоўку да праверкі і чысткі. Зроблена шэраг дакладаў на пленумах, абслужаны сіламі АКК райёны і горад. АКК сама і разам з АК КП(б)Б насылала шэраг дыректыўных лістоў аб чыстцы.

Пасьля гэтых мерапрыёмстваў АКК прыступілі да падбору членаў праверачных троек. Склад троек абгаворваўся на сходах партыйных ячэек. На адводах ячэек АКК адвяла адразу 9 чал., потым у парадку праверкі членаў праверкомаў былі адведзены яшчэ 10 чалавек.

Зараз працуюць 126 членаў праверкомаў. З праверкомамі праведзен дастатковы інструктаж і зараз праводзіцца шляхам выкліку старшынь праверкомаў у АКК, пасылкай членаў прэзыд. АКК і бюро АК тыя ці іншыя хібы ў працы адразу выпраўляюцца.

Як працуюць камісіі.

АКК дала ўстаноўку камісіям, каб яны перад чысткай, дні 3 пабылі на месцы, знаёміліся з працай і становішчам арганізацый, таксама знаёмілі-б масы з задачамі праверкі і чысткі.

Гэта ажыцьцёўлена. Пасьля гэтага камісіі праводзілі ў райёнах пашыраныя пленумы РК і сходы вайсковых парткалектываў, дзе падводзілі вынікі падрыхтоўкі. Заслухоўвалі даклады аб становішчы партарганізацыі і прыступалі да чысткі праверкі.

Разам з гэтым у большасьці райёнаў складзены ўдарныя групы з партыйцаў і камсамольцаў, якія па вёсках праводзяць сходы, гутаркі і абвяшчаюць, калі і дзе будзе праверка. Вынікі падрыхтоўкі добрыя. У значнай частцы райёну сяляне прыходзяць за 15-20 верст з клумкамі. Ёсьць выпадкі, што камісіі працуюць да раніцы, бо прыехаўшыя сяляне просяць хутчэй скончыць, каб яны мелі магчымасьць вярнуцца да дому.

АКК дала ўстаноўку камісіям, каб апошнія заняліся больш пытаньнямі выяўленьня сацыяльнага паходжаньня. Камісіі карыстаюцца вялікім аўтарытэтам. Камісіі разгарнулі самакрытыку ў Чырвонай арміі, у вёсцы, склалі вынікі аб працы партарганізацыі ў тых ячэйках, дзе прайшла праверка чыстка і далі напрамак у працы.

Па Віцебскай акрузе.

У Віцебскай арганізацыі прароблена тая самая праца, што і ў Менскай. Зараз працуюць камісіі ў 6-ці райёнах і ў вайсковых арганізацыях. У працы камісіі ёсьць шэрах хібаў. У Ж-ай дывізіі камісія не абвяшчала вынікаў праверкі. У Лёзьненскім райёне праверана 47 чал. і ідуць спрэчкі аб выключэньні толькі аднаго. Праўда, АКК ня зьбіраецца ўстанавіць процантаў, але гэта сьведчыць аб слабасьці працы гэтай камісіі. На адным сходзе ў Лёзьненскім райёне сабраліся ўсе пазбаўленыя выбарчага права і толькі ў працэсе працы яны былі ўдалёны. У адным сельсавеце Лёзьненскага райёну ўсе ўстаноўкі аказаліся ў руках заможнай часткі.

Папярэднія вынікі.

Па Менскай акрузе з ліку праверанных вайсковых арганізацый выключана 8—9 проц., а ў вясковых 6—7 проц.; на такую-жа колькасьць накладзены і партспагнаньні. Такі-ж прыблізна процант у Віцебскай арганізацыі.

Настрой партмасы станоўчы—кожны адчувае, што праверка і чыстка ўзьнімуць здольнасьць партыі. У тых райёнах і ячэйках, дзе шмат ёсьць нягодных, адчуваецца прышыбленасьць (Самахвалавіцкае і Фаніпольскае ячэйкі).

Актыўнасьць з боку беспартыйных дастатковая.

Што неабходна яшчэ выправіць.

(З прамовы т. Калініна).

З дакладу відаць, што яшчэ некаторыя члены камісіі блытаюцца ў пытаньнях каго трэба выключыць. Яшчэ раз трэба праверыць, уразумець інструкцыі.

Неабходна ўдасканаліць выезд членаў АКК на месца. Моманты выпіўкі зусім не высьвятляюцца, а гэта неабходна. Неабходна добра ўлічыць матар'яльнае становішча вясковых камуністаў, бо для нас ёсьць пагроза, што больш моцныя сяляне застаюцца ў партыі, а беднякі будуць вычышчаны. У некаторых партарганізацыях могуць быць кругавыя парукі—адзін будзе абараняць другога. Трэба прымусіць усіх партыйцаў гаварыць аб недахопах, аб хібах. Тыя сэкратары райкомаў і вчэек, якія кепска падрыхтавалі арганізацыю да чысткі, павінны быць ня толькі зьняты з працы, але і выключаны з партыі. Члены праверкомы, якія не змаглі арганізаваць работу, разгарнуць самакрытыку, павінны быць зьняты з праверкомаў. Тэхніка абвяшчэньне адыгрывае вялікую ролю асабліва ў вёсцы. Неабходна, каб камісіі перад выездам у вясковыя ячэйкі пабылі ў некаторых вёсках і правялі растлумачальную працу.

Праверкомы павінны ўказаць партыйцам аб узьвяцьці палітычнага ўзроўню. Толькі тады праверка і чыстка ачысьцяць партыю ад усяго нядоднага і будзе садзейнічаць узьняцьцю ўсяе партпрацы.

Полк правярае.

(№-кі Чырвонаштандартны стр. полк).

Чырвонаштандартцы прыступілі да выконваньня пастаноў XVI Усесаюзнай Камуністычнай Партыі (бальшавікоў). Першы арганізацыйны сход, на якім прысутнічала звыш 1500 чалавек, быў пачаткам да чысткі партыйнай арганізацыі. Пасьля заўвагі камісіі аб мэтах чысткі, быў зроблены справаздачны даклад бюро к-ву аб рабоце партарганізацыі. Па дакладу выступіла 16 асоб у тым ліку і беспартыйныя. Выказваўшыяся застанаўліваліся на ўсіх момантах работы бюро к-ву. Першы сход прайшоў з вялікай ажыўнасьцю.

Першая праходзіла чыстку ячэйка палкавой школы. Камісія вельмі ўважліва адносілася да партыйцаў, якія праваряліся.

Чыстка ячэйкі палкшколы працягвалася 2 дні. У першы дзень пры перапоўненай залі была заслухана справаздача сэкратара ячэйкі т. Мароза, які выпучыў адмоўныя і станоўчыя бакі працы. У спрэчках указвалі на недахопы работы. Пасьля гэтага пачалася праверка.

Адзін за другім праходзяць камуністы перад чырвонаармейска-курсанцкай масай, усе дэманструют свою работу. Кожныя праходзяць хутка, аб іх няма сумненьня і могут быць членамі партыі.

Але ёсьць і такія, якія раблі спробу хаваць маемаснае становішча. Напрыклад, Клачко казаў, што ў бацькі яго ёсьць 5 з паловай дзесяцін зямлі, у той час калі ў даведцы паказана больш зямлі і жывёлы.

Вячэрняе пасяджэньне было пачата праверкаю ваенкома палка тав. Коўзуна, усе слухалі з вялікай увагаю яго апавяданьне. Паходзіць з сялян, бацькі мелі 2 з паловай дзесяцін зямлі, у партыі з 1920 году, ня мае ніякіх партспагнаньняў, вайсковую службу пачаў радавым чырвонаармейцам і стаў камісарам без усялякіх курсаў, перепадрыхтовак. Шмат выступала у спрэчках, і падкрэсьлівалі, што тав. Коўзун, ідэалёгічна вытрыманы камуніст. Адзін беспартыйны, т. Ступнікаў апавядае сходу: „я працую доўга ў палку і ведаю тав. Коўзуна, ён улівается у масу прастым і незаметным, гэта дае магчымасьць лепш вывучаць работу, ён паяўляецца там, дзе яго не чакаеш", Тав. Коўзуна ведаюць добра і рабочыя гор. Барысава. Рабочы зав. „Домбаль", пераменьнік тав. Баркан гаворыць: т. Коўзуна ведаюць добра рабочыя, яны расцэньваюць яго як стойкага і прэданага рабочай клясе. Наступным праходзіць начальнік палкавой школы тав. Раманавіч, член партыі з 1921 году, селянін. Таварышы падкрэсьлілі, што т. Раманавіч выходзіў з рамак камуніста перагібаў дысцыплінарную практыку, запоўнен фармалізмам, трымае сабе ў пазашкольны час, ня як камуніст, а як „начальнік". Няхай гэта будзе тав. Раманавічу ўрокам на далейшы час, так казалі выступаючыя.

Стаў перад масай і камісіяй, і такі „камуніст", Шрамаў, які гаворыць, што яго бацькі маюць 8 дз. зямлі, але тут-жа мясцовыя курсанты папраўляюць, што ня 8, а каля 20 дз. і што ў час вясны 1928 году бацькі вывазілі прадаваць хлеб на рынак больш сотні пудоў тайна.

Далей чыстку праходзяць ячэйкі 1-га батальёну. У часе чысткі прысутнічаюць усе чырвонаармейцы кадру і тэрскладу. Па дакладах сакратароў партячэек выступаюць у спрэчках партыйцы і беспартыйныя. Першым ідзе тав. Бабіч, селянін, камроты, член партыі з 1919 г. добры камандзір і партыец.

Чыстка праходзіць пры актыўным удзеле ўсёй масы і шырока разгорнутай самакрытыкі.

У часе чысткі палкавая шматтыражная газэта „На варце краіны" выпускаецца цераз кожныя два дні. Выпуск газэты сацыяльна прысьвечан чыстцы партарганізацыі. Таксама павялічыўся выпуск ільлічовак па ротах. У газэты артыкулы паступаюць многа ад беспартыйных.

Янка Лашкевіч.

Вытрыманыя таварышы.

(г. Горкі, Аршаншчына).

1-га ліпеня а 6-й гадзіне ў залі тэатру Акадэміі на сход зьявілася каля 600-700 асоб з гораду і Акадэміі.

Правярае камісія пад старшынствам т. Дамброўскага.

Першым правяраецца т. **Прохараў**, сын рабочага, сам рабочы, кандыдат ЦК КП(б)Б., член АК КП(б)Б., партыец з 1919 г., зараз працуе сакратаром Мсьціслаўскага РК КП(б)Б. Да гэтага часу працаваў сэкратаром Горацкага РК КП(б)Б. Пытаньняў было шмат. Спрэчкі кажуць за тое, што т. Прохараў вытрыманы бальшавік і правільна праводзіць клясавую лінію і дэрактывы партыі.

Другім правяраецца т. **Карг**, кандыдат АК КП(б)Б, партыец з 1919 г. сын рабочага, сам служачы, зараз працуе сакратаром Акадэмічнай ячэйкі КП(б)Б, служыў у Чырвонай арміі ў якасьці ваенкома. У спрэчках ахарактарызавалі т. Карга, як вытрыманага, аўтарытэтнага бальшавіка, як масавіка. Адначасова выказалі думку, што намечаныя кандыдатура т. Карга АКК у камісію па чыстцы партыі зусім падыходзіць.

Тав. **Паніматка**, з сялян, сын сярадняка, зараз студэнт IУ курсу Акадэміі, партыец з 1917 г., на працягу некалькіх год у Акадэміі быў нязьменным членам бюро ячэйкі КП(б)Б. Некаторы час працаваў у падпольлі, удзельнічаў у арганізацыі атрадаў супроць белых. Увесь час як да вучобы, так і ў часе вучобы займаў адказныя пасады.

Праведка трох асоб заняла каля 3 гадзін. У спрэчках выступалі як партыйцы, так і беспартыйныя.

І. Пташкоў.

Слукіным ня месца ў партыі!

На агульным сходзе партыйнай ячэйкі магілеўскае псыхалячэбніцы вынесена суровая вымова з папярэджаньнем сябру партыі Слукіну. Справа ў тым, што грам. Слукін растраціў грошы сяброўскія ўзносы настаўнікаў Дашкаўскага калектыву. Апошніх за „ня ўзнос" грошай болей, як за год(!) выключылі мэханічна з шэрагаў сяброў саюзу працасьветы. А грашыма карыстаўся Слукін.

Апроч таго, за Слукіным наглядаліся моманты замазваньня самакрытыкі, гонар і іншыя вельмі неэтычныя ўчынкі.

Так, аднойчы ў рэдакцыю насьценнае газэты паступіла заметка, выкрываючая нядбайную працу Слукіна ў 2-й дзіцячай камуне. Факты расьсьледваньнем пацьвердзіліся, але пад нажымам Слукіна, заметка ў газэту не пашла.

Даведаўшыся, што гэтую заметку пісала камсамолка, Слукін сказаў ёй у „абурэньне":

— Я цябе вышвырну з камсамолу!

Слукін надта „своеобразно" адносіцца да жанчын. Яго любоўная справа ўносіць склоку ў сямейнае жыцьцё партыйцаў.

Да камсамоліі Слукін адносіцца «з гары ўніз».

Бязумоўна, Слукіна можна разглядаць як тыпа, шкоднага партыі і таму пралетарскаму асяродзьдзю, сярод якога ён „працуе".

Юр.

БУДЗЕМ МЕЦЬ СВАЮ РЫБУ.

У БССР АРГАНІЗУЕЦЦА РЫБА-ГАСПАДАРЧЫ ТРЭСТ З АСНОЎНЫМ КАПІТАЛАМ У 600.000 У 1929-30 Г. МАЮЦЬ БЫЦЬ АРГАНІЗАВАНЫ 8 НОВЫХ РЫБАВОДНЫХ ГАСПАДАРАК, НА АРГАНІЗ ЯКІХ ВЫЗНАЧАНА 250.000 РУБ.—ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ТЭХНІКАЎ ПА РЫБНАЙ ГАСПАДАРЦЫ РЫ НАЯ ПРАФШКОЛА Ў МАЗЫРШЧЫНЕ РЭАРГАНІЗУЕЦЦА СЁЛЕТА Ў 9-ЦІГОДКУ.

Урад БССР надае вялікае значэньне рыбаводнай праблеме. Бярэцца курс на тое, каб у працяту бліжэйшага 5-ці годзьдзя рыбаводную гаспадарку паставіць так, каб поўнасьцю забясьпечыць патрэбу насельніцтва ў сьвежай рыбе, бо зараз штогадовы дэфіцыт у рыбе дасягае 5.400 тон.

Атрыманьне такой масы рыбы вымагае рашучых мерапрыёмстваў і вялікіх сродкаў. У зьвязку з гэтым Землплян НКЗ пастанавіў арганізаваць у БССР рыбагаспадарчы трэст са зваротным капіталам у 600.000 руб. У наступным годзе мае быць арганізавана 8 новых рыбаводных гаспадарак: на штучная сажалка на 1800 гэкт. у Мазырскай акрузе, 2 вазёрныя гаспадаркі ў Віцебшчыне і 5 рачных на р. р. Прыпяці, Дняпру, Бярэзіне, Сожу, Друці. Капітальныя затраты на абсталяваньне гэтых гаспадарак вызначаны ў разьмеры 256.000 руб. такім чынам, на лета ў БССР будзе ўжо 15 рыбаводных гаспадарак (7 гаспадарак існуе зараз). Шырокая пастаноўка працы па рыбаразьвядзеньню вымагае пашырэньня навуковых досьледаў па гэтай важнай галіне гаспадаркі. Н.-Д. Інстытут Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя Леніна ўводзіць сёлета па вывучэньню рыбаводзтва 4 навуковыя адзінкі. У Вялікай Сьлепні арганізуецца штучная сажалка на 50 гэкт. Апроч гэтага, сёлета арганізуюцца экспэдыцыі для вывучэньня нашых прыродных вадаёмаў, дзеля ўстанаўленьня іх прыгоднасьці для рыбаразьвядзеньня. Вялікая ўвага будзе зьвернута на вывучэньне праточных вазёр, што зьяўляецца неабходнай умовай пры разьвядзеньні судака.

Прымаюцца захады да пашырэньня ведаў па рыбаразьвядзеньню. Беларуская С.-Г. Акадэмія ўводзіць выкладаньне спэцыяльнага прадмета. Рыбаводная прафшкола ў Мазыршчыне з сёлетняга году рэарганізуецца ў 9-ці годку. Спачатку ў яе будуць прымацца скончыўшыя 4-хгодку, а пазьней—7-мігодку. Сёлета будзе прынята 40 чалавек, пераважна батракоў з рыбных гаспадарак. Разьвёрстка вучняў зроблена наступная: Палацкая і Мазырская акругі—па 6, Віцебская—5, Менская, Бабруйская і Гомельская па 3, Магілеўская і Аршанская па 2 месцы.

На пашырэньне школы сёлета асігнуецца 35.000 руб.

Робяцца захады да ўстанаўленьня ўвязкі рыбнай справы з мэліарацыяй і торфараспрацоўкамі. При ваньні і адшуканьні мяліо фондаў будуць адразу вывучаны забалочаныя абшары, якія не для земляроблства, але могуць добра выкарыстаны на арг рыбаводных гаспадарак. Такі дуць адразу выкарыстоўвацца тыя-ж мэты ўсе ваданяны якія пакідаюць пасьля сябе ... т-вы, дзеля чаго яны павінны адразу праводзіць належную

Што-ж датычыцца мальку, у нас хапае; зараз нават ... такія ўмовы, калі полацкая гаспадарка павінна штр міць маладняк, бо 55.000 м змогуць знайсьці сабе корму і вадаёме. Апроч гэтага, у Бел гаспадарцы знаходзяцца 75.00 коў. У гаспадарцы «Чырвона ёсьць ужо 18000 карпаў-г 41000 2-хгадавікоў і 690 ... каў. Сёлета ўвосень БССР ... да 65 тон свайго карпа.

Паўстае пытаньне аб арг рыбных т-ваў. У першую чар ны заняцца рыбаводствам на гасы, большасьць якіх маюць тэрыторыі розныя сажалкі і ...

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

912 тысяч рублёў на капітальнае будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы.

ГОМЕЛЬ, 8-7. На капітальнае будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы ў бягучым годзе па акрузе затрачваецца 912 тысяч рублёў.

З гэтых 912 тысяч будзе выдаткавана 283 тысячы на мэліарацыйныя работы, 270 тысяч на лесаўпарадкаўчыя, 134 тысячы на землеўпарадкаўчыя, 14000 руб. на пабудову вэтбольніцаў, 7 тысяч на пашырэньне агрупунктаў і 154 тысячы на іншыя патрэбы.

Правялі тыдзень праверкі выйгрышаў.

Полацак, 8-7. Закончыўся тыдзень праверкі выйгрышаў, які праводзіўся акруговай касай ашчаднасьці, сельбанкам, дзяржбанкам і крэдытным таварыствам.

У сувязі з тым, што да гэтага часу маецца яшчэ шмат неатрыманных выйгрышаў і проц. па купонах, зроблена масавая праверка выйгрышаў, якія там-жа былі аплочаны.

Апрача гэтага, праводзілася шырокая праца па растлумачэньню сутнасьці дзяржаўных пазык, аб іх карысьці і трыманьні на руках.

На барацьбу са шкоднікамі.

(Койданаўскі р., Меншчына).

Праца па барацьбе са шкоднікамі ў Койданаўскім р-не ідзе шпаркім тэмпам. Па р-ну арганізавана 9 пунктаў, якія кіруюць гэтай працай. Кіраўнікамі пунктаў зьяўляюцца аграномы, а дзе нема агранамаў, дык кіраўнікі савгасаў, а таксама прыцягнуты да гэтай працы і арганізацыі ТДА-Авіахіму.

Усе пункты практычна ўжо прарабілі шмат працы па барацьбе са шкоднікамі як у савгасах, так і сялянскіх гаспадарках, якая праводзіцца шляхам выхаду ў вёску агранамаў і інш. з адпаведнымі матар'ялмі і інструмэнтамі.

М.

Выканаем пастановы зьезду саветаў

Ворша, 9-7. Для забясьпечаньня поўнага і своечасовага выкананьня пастаноў III акруговага зьезду Саветаў Аршаншчыны, прэзыдыум акрвыканкому абавязаў акруговыя інспэктарыяты, аддзелы і акруговага інжынэра распрацаваць мерапрыёмствы па выкананьню дырэктыў зьезду саветаў. Акрсельсаюз, Днепрасаюз і ЦРК на падставе пастаноў зьезду саветаў павінны распрацаваць пляны вытворчага каапэраваньня беднаты і наогул працоўнага насельніцтва, павялічэньня пая, увязваючы гэтыя пляны з пяцігодкай.

Калгассаюз павінен распрацаваць пляны калектывізацыі бядняцка-сярадняцкіх гаспадарак з разьлікам, каб плошча калгасаў пашыралася ... год ня менш, як на 3 проц. ... най плошчы зямлі акругі. ... новы і арганізацыі кожнае ... дзе павінны правяраць фактычн каканьне пастаноў зьезду ... згодна сваіх плянаў. Прэзыдыум ... канкому абавязаў саветы і рай комы пэрыядычна рабіць справ перад выбаршчыкамі аб сваей ... насьці, завастраючы ўвагу на ... таньні выкананьня наказаў.

У сваю чаргу і акрвыканком ... рабіць справаздачу аб сваей ... ці ня менш як два разы ў год ... нумах райвыканкомаў, саветаў ... бочых і сельскіх сходах.

А.

ДВУХМЕСЯЧНАЯ ВАЛАКІТА.

(Калінкавіцкі р., Мазыршчына).

У в. Рудні-Антонаўскае сяляне для мэліарацыі балота сабралі больш 1000 рублёў самаабкладаньнем. Сапраўды, у гэтай вёсцы лепшую частку зямлі займаюць балоты і вясною ці ўвосень нават праехаць ня можна.

Аб сабранай колькасьці грошай Антонаўскі сельсавет паведаміў Калінкавіцкі РВК і прасіў выслаць мэліаратара, ці гідратэхніка, а райвыканком гэту просьбу пераслаў ў Мазырскі акрэа, які толькі пасьля месяца выслаў мэліаратаршу. Мэліаратарша, прыехаўшы на вёску, пагутарыла з ... намі і сказала:

— Я прыехала бяз інструм ... прыеду ў панядзелак і пачнем ...

У панядзелак сяляне сабраліся, ... ісьці з мэліараташай на працу ... апошняя ня прыехала, а з таго ... дзелка прайшло яшчэ чатыры ... дзелкі, а мэліаратаршы няма.

Антонаўскія сельсаветчыкі ез ... езьдзілі ў райвыканком і на акрэа, але нічога не дабіліся, а ... лепшы час для мэліарацыйнай ... праходзіць.

Н. Б. Ланд

ВЭТЭРЫНАРНАЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ.

ВОРША, 9-7. У мінулым годзе па акрузе згодна пляну вэтэрынарнага абслугоўваньня меркавалася пабудаваць вэтэрынарную лячэбніцу ў Горках і цёплыя манежы пры Мсьціслаўскім, Круглянскім і Багушэўскім вэтпунктах. Аднак гэта ня было выканана з прычыны таго, што замест выкананьня пляну былі распачаты пабудовай вэтлячэбніцы ў Дрыбіне і Багушэўску і цёплага манежу ў Чарэі. Таксама былі набыты памяшканьні для вэтпунктаў у Лядох і ў вёсцы Пуглязі. Такім чынам будаўніцтва намечанага плянам зацягнулася, ня гледзячы на тое, што з боку Акрвыканкому былі папярэджаньні.

Здавальняюча пастаўлена было абслугоўваньне насельніцтва. Па пляну прадугледжвалася нагрузка для кожнага пункту 4000 галоў жывёлы, а на справе нагрузка была перавышана кожным пунктам у сярэднім на 200 галоў. Амбулаторным прыёмам было абслужана 57.499 жывёлы і шляхам выезду на месцы 5658 галоў. На станцыянарным лячэньні ў лячэбніцах знаходзілася 97 галоў жывёлы. Па барацьбе з эпізоотыямі зроблена на прышчэпак: супроць сібірскай язвы 3620, супроць рожы і чумы сьвіней 9361 і шаленства—657. Ня выкананы толькі заданьне па тубэркулінізацыі маленізацыі.

Не забыта была і вэтсанасьветная праца. Было праведзена 298 лекцый 485 гутарак.

Улічваючы недахваты мінулага году вэтбудаўніцтву, прэзыдыум акрвыканкому запрапанаваў акрэмаддзелу жы ка прытрымлівацца плянавых заданьняў асабліва наглядаць за тым, каб новабудаўніцтва ўкладвалася ў рамкі адпу ных сродкаў.

А. Ц.

Конкурс на загатоўку сыравіны.

ГОМЕЛЬ, 9-7. У апошнія часы загатоўкі сельска-гаспадарчай сыравіны паслаблі. Каб узмацніць загатоўкі сыравіны, намячаецца правесьці конкурс на лепшы раён па загатоўцы сельска-гаспадарчай сыравіны.

Для кіраўніцтва загатоўкамі пры акргандлю ўтворана акруговая конкурсная камісія. Лепшыя раёны будуць прэміраваны. У шмат якіх селішчах акругі арганізоўваюцца арцелі з бядняцкай часьці насельніцтва для збору рознай сельска-гаспадарчай сыравіны.

Кантрольныя лічбы бюджэту

Гомель, 9-7. Па кантрольных лічбах бюджэту 29-30 году намячаецца выдаткаваньне на розныя мерапрыемства 12,085 тысяч руб. З пакажанай сумы мяркуецца выдаткаваць 5.424 тысяч руб. на патрэбы народнай асьветы. У параўнаньні з мінулым годам выдаткі павялічваюцца на 2.500 тысяч руб. На патрэбы аховы здароўя будзе выдаткавана 1.316 тысяч руб. на мерапрыёмствы па сельскай гаспадарцы—528 тысяч руб., па камунальнай гаспадарцы—892 тысячы руб., на прамысловае будаўніцтва—880 тысяч рублёў.

Вярбоўка ў вайсковыя школы пад пагрозай зрыву.

Падрыхтоўчая работа да канчатковай вярбоўкі ў вайсковыя школы па Полацкай акрузе вядзецца вельмі слаба. Партыйныя, прафсыяпальныя, камсамальскія арганізацыі не правялі яшчэ належнай растлумачальнай работы ў гэтай галіне.

Напрыклад, на заводзе „Труд" маецца каля 1500 чал. моладзі ад 17 да 22 год. Здавалася-б, што адсюль можна чэрпаць кадры ў вайсковыя школы. Але пакуль што ад заводу „Труд" ёсьць толькі 3 заявы, ад чыгуначнікаў ёсьць 5 заяў і ад членаў саюзу рабземлесу 5 заяў. Усяго з 86 заяў толькі 13 ад рабочых, астатнія вучні і сяляне. Тут стаіць кампанія пад пагрозай зрыву.

Цікава адзначыць, што на заводзе „Труд" нават зусім не абгаварвалася ... мянёнае пытаньне, некаторыя ... большасьці аб гэтым ня ведаюць. Аб ... говая камісія таксама працуе слаба. ... вающа і намечаныя пляны не правод ... ца ў жыцьцё.

Грамадзкім арганізацыям ... прафсаюзам Полаччыны неабходна ... рока разгарнуць гэтую працу, бо ... ня па вярбоўцы ў школы, а-за ... насьці зрываецца.

М.

Рыхтуемся да тыдню супроцьпажарнай аховы.

(Рагачэўскі р., Бабруйшчына).

Тыдзень супроцьпажарнай аховы распачаўся па райёну з 1 ліпеня, але калі прыглядзецца, як ён праходзіць, дык вельмі дрэнная ўражаньне атрымаецца.

В.-Крупынаўскі с.-с. на пасяджэньні прэзыдыуму добра абмеркаваў гэта пытаньне, але калі сталі прыходзіць к вынікам, то аб'ектыўныя ўмовы не даюць магчымасьці правесьці тыдзень супроцьпажарнай аховы вгодна меркаваньню дасланых з райвыканкому.

Так, два населеныя пункты ў сельсавеце правялі самаабкладаньне на папаўгода бяз усякага скарыстаньня, бо пажарных машын недзе дастаць.

Прыслалі ўсяго 2 на райён, дык чо ... не абліліся некаторыя сельсаветы за ...

Але-ж выкладзячы з мажлівасьцяў будзе праведзена наступная праца: 7 ліпеня ... будзецца рэпэтыцыя пажарных ... Мяркуецца правесьці сходы сяляні ... паставіць пытаньні выключна аб небяс ... печнасьці пажараў у вёсцы, асабліва ... ўлетку членамі сельсавета сумесна ... пажарнымі старастамі будзе зроблена ... праверка аб ачыстцы дымоходаў, бу ... пашырана дабраахвотнае страхаваньне ... будынкаў у павялічаным разьмеры, пла ... рыхтаваны будуць студні, з якіх можна ... было-б даставаць ваду для тушэньня ... жараў.

Я. Крушына.

ШТО РОБІЦЦА НА ПАЛЁХ.

Чаму няма землеўпарадкаваньня.

(Чачэвіцкі р., Маг. акругі).

Недалёка, кілёмэтра паўтара, ад Бабруйска-Магілеўскага шляху знаходзіцца вёска Збышына.

З аднаго боку гэтай вёскі быў абшарніцкі маёнтак, з другога—сталыпінскія хутары, якія моцна сьціснулі вёску, не даючы ні жывёліну дзе пусьціць, ні самому выйсьці, а на сваёй зямлі разгарнуцца недзе было, бо вёска тады была ў 40 двароў, а зямлі 100 дзес., ды і тая парэзана на 10-20 палосак.

Пасьля кастрычніка 1917 г. сяляне Збышына пачулі сябе больш вольна, зямля ад абшарніка і папа была адабрана і перадана бяднейшаму сялянству.

Але цераспалосіца, якая была і зараз ня зьменшылася, а ў некаторых выпадках павялічылася.

Збышынцам далей так жыць нельга і з 1921 г. яны пачынаюць думаць аб землеўпарадкаваньні.

Яны атрымалі весткі, што Збышын занесен у плян землеўпарадкаваньня ў першую чаргу.

Збышынцы чакаюць, чакаюць год, 2 гады.

У ваколічных вёсках пазьней пачалі, ды ўжо і землеўпарадкаваліся, а збышынцы ніяк ня могуць.

Бязумоўна, тут зрыў землеўпарадкаваньня не абышоўся без падкулачнікаў. багатыровых, ды дзесятнікаў, якія як прадстаўнікі ад вёскі езьдзілі ў Гомельскі губземаддзел.

У 1926 годзе збышынцы падаюць заяву ў свой РВК аб правядзеньні землеўпарадкаваньня ў Збышыне. А ў 1927 г. РВК высылае прадстаўніка для правядзеньня падрыхтоўчай працы ў Збышыне па землеўпарадкаваньні.

Дапамагла ў гэтым і яч. КСМ, сабралі сход, усе як адзін падпісаліся за землеўпарадкаваньне, склалі пасямейныя сьпісы, адаслалі ў РВК, на гэтым справа і скончылася. Але ў 28 годзе, калі ўпаўнаважаныя запыталі ў старшыні Чачэвіцкага РВК т. Трызна пра землеўпарадкаваньне, дык ён сказаў: „Мы зараз бярэм курс на калектывізацыю, давайце калектыў, тады і землеўпарадкаваньне правядзём.

—Ну, дык давайце, у нас людзі знойдуцца—адказваюць упаўнаважаныя. На гэтым скончылі і пачалі чакаць арганізацыі калгасу.

РВК даручыў падрыхтаваць глебу да арганізацыі калгасу ў Збышыне старшыні с.-с. члену КПБ т. Савіцкаму.

Але той вёў падрыхтоўку ды ў другі бок, скарыстоўваючы ўсе магчымасьці, каб сарваць арганізацыю калгасу.

Але сяляне на кожным сходзе пытаюць, крычаць аб землеўпарадкаваньні, многія прадстаўнікі ад сав. органаў абяцаюць паставіць пытаньне там, дзе трэба і ўсё-ж нічога няма.

Прадстаўнік Магілеўскага АВК па перавыбарах с.-с. узялася на сходзе за гэту справу, запісала 15 чал. у калгас, якія і лічылі сябе ўжо калгасьнікамі, а між тым „воз и ныне там".

Збышынцы засталіся, як і раней, на сваіх палосках, прычым лаюць савецкіх працаўнікоў за бюракратызм.

Неабходна падумаць над землеўпарадкаваньнем Збышына.

Буглак Я.

Землеўпарадкаваньне ідзе добра.

(Круглянскі райён, Аршаншчына).

Землеўпарадкаваньне ў нашым райёне ў сёлетнім годзе значна пасунулася ўперад, і калі так будзе ісьці далей, то да канца пяцігодкі райён землеўпарадкуецца цалкам у буйныя пасёлкі.

Усяго намечана па райёну у сёлетнім годзе правесьці землеўпарадкаваньне на 13.509 гэктарах зямлі. Хоць лічба не маленькая, але яна будзе выканана, бо каморніцкімі сіламі райён забясьпечан здавальняюча, усяго па райёну працуе 23 каморнікі.

Здавальняюча вядзецца ў кожнай вёсцы і падрыхтоўчая праца да землеўпарадкаваньня. Ня гледзячы на тое, што заможная частка вёскі выступае актыўна супроць землеўпарадкаваньня, асаблівая ўвага пры правядзеньні падрыхтоўчай працы зьвяртаецца на арганізацыю ў вёсцы калгасаў, буйных пасёлкаў і на зьнішчэньне імкненьняў з боку насельніцтва выхадаў на хутары. Трэба адзначыць, што выхады на хутары значна зьменшыліся.

У справы калгаснага будаўніцтва ў час землеўпарадкаваньня мы маем наступнае: на сеньнешні дзень арганізавана і афармлена 4 новыя калгасы з плошчай ад 120 да 200 гэктараў кожны. Але маюцца пэрспэктывы, што па райёну ў землеўпарадкаваючых вёсках будзе арганізавана яшчэ 3 калгасы.

Трэба адзначыць, што пазіраецца вялікае імкненьне з боку насельніцтва ў пераводзе на шматпольле, гэта імкненьне скарыстоўваецца. Кожная землеўпарадкаваючаяся вёска адразу-ж разьбівае свае палі на шматпехьны севазварот у большасьці на дзевяціпольны і васьміпольны.

М. Дзергачоў.

Гняздо контр-рэвалюцыі.

(Самахвалаўскі райён, Меншчына)

У в. в. Выцкоўшчына і Грытчына праводзіцца земляўпарадкаваньне. Працу праводзяць 4 каморнікі.

З гэтых зямель неабходна вырэзаць вучастак на калгас, але мясцовыя заможнікі пад кіраўніцтвам папа, напалі на каморніка і запатрабавалі ад яго зямельнага надзелу для папа. Каб захаваць сябе ад нападу разьюшаных заможнікаў, каморнік пообяцаў выканаць іх запатрабаваньне. Бандыты ўцяхамірыліся і пашлі дамоў.

На „Івана Купалу" поп у царкве зьвярнуўся да „набожных" з такой прамовай: людзі „безнравственные". Культура наша ўцякае ад нас, бо людзі ёю кіруюць цёмныя. Будаваць сацыялізм не давядзецца, бо хутка цар і паны і сініуць урад антыхрыста. Да возрадуюцца і возвеселяцца людзі тады, о, овцы, мае возлюбленные о Хрысьце, амін".

Неабходна належным органам зьвярнуць увагу на гэта здарэньне і паказаць контр-рэвасюцыйнай зграі яе ўласнае месца.

М. Цырлін.

НА ШЛЯХУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПУ.

„ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК“ АДБІЎ НАСТУП КУЛАКОЎ.—„МУДРЭЦ“ РОБІЦЦА ПРЫКЛАДАМ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.—ПЕРАШКОДЫ КУЛАКОЎ НЯ СПЫНЯЦЬ РАЗЬВІЦЬЦЯ „ЧЫРВОНАГА ПРАЦАЎНІКА“.—„СІЛА“, „МІНА“ І „ІЛЬЛІЧ“ ПАВІННЫ БЫЦЬ АБ'ЯДНАНЫ Ў БУЙНЫ КАЛГАС.

На шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

За кароткі параўнаўча тэрмін, дзякуючы актыўнай дапамозе партыі, дзяржаўных органаў і ўсёй савецкай грамадзкасьці, калгасны рух выявіў вялікую жыцьцёвасьць і здольнасьць прасоўваньня да вынешніх форм буйнай аграмаджанай гаспадаркі. Такое разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва стала магчымым уласна на этапе рэканструкцыі ў выніку магутнага ўздыму сацыялістычнай прамысловасьці, якая павялічыла вытворчасьць сельска-гаспадарчага інвэнтару амаль у тры разы—у параўнаньні з даваенным часам. Намечаны плян сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва, які прадугледжвае павялічэньне прадукцыі з 153 млн. рубл. у 1927-1928 г. да 610 млн. у 1932-33 годзе адчыняе перад калгасным рухам яшчэ больш шырокія пэрспэктывы разьвіцьця. У справе забясьпечаньня машынамі БССР мяркуецца ў працягу бліжэйшых 3 год яусім замяніць саху плугам і завесьці за 5-нігодзьдзе ня менш 2.300 трактараў для забясьпечаньня імі ў першую чаргу савецкіх і калектыўных гаспадарак і для апрацоўкі мэліараванай зямлі. Абхват забясьпечаньня машынамі вызначаецца за 5 год у суме 71 млн. руб.

Рост калгасаў прад'яўляе народнай гаспадарцы павышаныя запатрабаваньні, ставіць новыя задачы, якія павінны быць разьвязаны. У першую чаргу высоўваюцца задачы ўзбуйненьня калгасаў, узмацненьня ў іх элемэнтаў аграмаджанасьці і забясьпечаньня перарастаньня каапэрацыйных аб'яднаньняў у калгасы і ніжэйшых форм калгасаў—у вышэйшыя.

Намячаючы да канца пяцігодкі ўцягненьне ў калгасы каля 23 проц. усіх сялянскіх двароў Саюзу, пяцігадовы плян народнай гаспадаркі прадугледжвае значнае ўзбуйненьне калгасаў. К канцу пяцігодкі плошчу аграмаджаных пасеваў у калгасах мяркуецца павялічыць да 30 млн. гэктараў, што складае каля 22 проц. усёй пасеўнай плошчы Саюзу, пры гэтым сярэдні разьмер пасеўнай плошчы калгасу па СССР павінен дасягнуць к канцу пяцігодкі 320 гэктараў.

Па БССР аграмаджаньне сельскай гаспадаркі мяркуецца вызначыць у такім разьмеры, каб да канца пяцігодкі было занята пад аграмаджаным сэктарам 18 проц. усіх пасеўных плошчаў. Сярэдні разьмер калгасаў па БССР устаноўлен у 166 гэктараў.

У працягу пяцігодкі будзе ўзмацняцца працэс арганізацыі калгасаў-волатаў з плошчаю ў некалькі тысяч гэктараў, са значнай канцэнтрацыяй магутных сродкаў вытворчасьці.

Адначасова з узбуйненьнем павінна ісьці ўсё большае аграмаджаньне вытворчасьці і працы членаў калгасаў. Дзеля гэтага неабходна ўзмацніць уплыў калгасаў на сялянскую гаспадарку, у прыватнасьці, шляхам аб'яднаньня апэрацыйна-гаспадарчых функцый нізавым калгаснымі аб'яднаньнямі, якіх да гэтага часу няма. Наданьне апэрацыйна-гаспадарчых функцый калгасным аб'яднаньням паслужыць штуршком для разьвіцьця спэцыялізацыі вытворчасьці ў калгасах і ўзмацніць іх сувязь з каапэрацыйнымі сыстэмамі. Наданьне апэрацыйных функцый узмацніць імкненьне да разьвіцьця таварнасьці, будзе адпавядаць запатрабаваньням рынку і прамысловасьці і бязумоўна будзе таксама спрыяць перарастаньню каапэрацыйных форм у калгасы.

Пашырэньне кола дзейнасьці калгаснай сыстэмы не павінна, аднак, ні ў якім разе весьці да адрыву ад агульнай сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі. Такі адрыў быў бы вялізнай памылкай, бо ў нашых умовах кожная сыстэма сельска-гаспадарчай каапэрацыі—малочная, ільнаводная і інш. стваральна тыя формы аб'яднаньня індывідуальнай сялянскай гаспадаркі, якія потым перарастаюць у вышэйшую форму—калгас.

Важнейшым фактарам узмацняючым працэсы аграмаджанасьці павінна стаць зямляўпарадкаваньне. У плянах зямляўпарадкаваньня трэба прадугледзіць максымальнае садзейнічаньне працэсам узбуйненьня і магчымасьці росту пасобных калгасаў. Зямляўпарадкаваньне павінна палягчаць уступленьне ў калгас новых членаў з бядняцкіх і серадняцкіх пластоў тэй мясцовасьці, у якой знаходзіцца калгас.

Рашаючай задачай у справе стварэньня буйнай гаспадаркі зьяўляецца таксама намнажэньне грамадзкіх сродкаў, якое павінна павялічваць зацікаўленасьць сяброў у грамадзкай гаспадарцы і папярэджваць зварот да індывідуальнай гаспадаркі. Калі ў калгасе ёсьць у агульным грамадзкім карыстаньні складаныя машыны, прамысловыя прадпрыёмствы па перапрацоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў, і калі гаспадарка наогул добра вядзецца, дык ніхто не захоча выйсьці з такога калгасу. Наадварот, ён стане прыцягваючай сілай для вакольнага насельніцтва. Задача няўхільнага ўзмацненьня грамадзкіх сродкаў (недзялімых капіталаў і інш.) павінна стаць цэнтральнай задачай калгаснага будаўніцтва.

Ва ўмовах сацыялістычнага наступленьня і абвастрэньня клясавае барацьбы калгас здольны выканаць гэту ролю толькі ў тым выпадку, калі ён арганізуе беднату, уцягне ў сацыялістычнае будаўніцтва серадняковую і, такім чынам, накіруе асноўныя масы сялянства на пераможаньне капіталістычных элемэнтаў і на будаўніцтва сацыялістычных форм гаспадаркі.

Калгасны рух ідзе пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў першых шэрагах сацыялістычнага наступленьня ў вёсцы, сьцьвярджаючы на справе правільнасьць курсу партыі на індустрыялізацыю краіны і калектывізацыю сельскае гаспадаркі.

С.

Сябры калгасу «Мудрэц» здаюць малако ў арцель.

Карлікавыя калгасы трэба аб'яднаць.

(Калінкавіцкі раён, Мазыршчына).

Калгас „Сіла“ каля вёскі Прудок арганізаваўся ў былым маёнтку ў 1920 годзе. У калгас прышлі беднякі, якія нічога ня мелі. Але пачалі працаваць, набылі жывёлу, сельска-гаспадарчы інвэнтар і іншае. Спачатку аб'ядналася 5 гаспадароў, зараз калгас налічвае 12 сем'яў.

Першыя заснавацелі калгасу „Сіла“ былі людзі пятутойныя, і погляд на іх быў як на „чужых“. Так глядзелі жыхары вёскі Прудок і на такую-ж дарожку пашлі і начальнікі, якія афармлялі калгас. 36 гэктараў пахаці адвялі „Сіле“—і баста. Малавата—крычалі піанэры калгаснага будаўніцтва. Хопіць—адказывалі начальнікі, і на 36 гэктарах пабудаваўся калгас «Сіла». 132 гэктары зямлі, што засталося, падзялілі паміж сабою тыя, у каго зараз робіць абрэзку.

Калгас „Сіла“—сапраўдная сіла. Калгас мае зараз розную жывёлу, у тым ліку 38 кароў, мае машыны і ўсё неабходнае для гаспадаркі. Але хлеба не хапае і не таму, што дрэнна працуюць, а таму, што па 3 гэктарыкі на сям'ю зямліцы маюць, у той час, як у вёсцы па 7-8 гэктараў у сярэднім на двор.

Поруч з калгасам „Сіла“ ў 4-х кілёмэтрах, у той-жа час арганізавалася сельска-гаспадарчая камуна «Міна». Камуна жыла некалькі год і некалькі год мясцовыя кулакі падкладывалі міны пад „Міну“. Камуна ня вытрывала і пераарганізавалася ў сельска-гаспадарчую арцель „Міну“. Жыве цяпер «Міна»; хлеб і да хлеба ёсьць, але цяжкае ўсё-ж такі жыцьцё, бо палоска і ў «Міне» жабрацкая.

На слабасьцях гэтых двух калгасаў кулакі будуюць горы плётак, і плёткі гэтыя ідуць далёка, але беднота цьвярозымі вачыма глядзіць на калгасы і не зьвяртае ўвагі на плёткі. Поруч з калгасам „Сіла“ арганізаваўся трэці калгас «Ільліч».

Рады райвыканкомаўцы Калінкавіцкага РВК, рады Мазырскі акркалгасаюз і акрза і паслалі каморніка зямляўпарадкаваць калгас „Ільліч“.

— Будзе тры калгасы адзін па адным,—мабыць, думалі сабе, паказаныя ўстановы. Калі-б другая думка ў іх была, то яны прынялі-б крокі, каб зьліць гэтыя тры карлікавыя гаспадаркі ў адну больш буйную. Тры гэтыя гаспадаркі яднаюць 31 сям'ю і маюць 31 гэктар зямлі. Няма на чым жыць.

У калгасе „Сіла“ красуецца крахмальны завод, які перапрацоўвае да 300 тысяч пудоў бульбы ў сэзон, але належыць ён Мазырскаму камунтрэсту, бо тры калгасы ўзяць яго ня могуць па сваёй слабасьці.

Здавалася-б, што і сьляпому відаць, што тут нешта трэба зрабіць; што трэба рассунуць рамкі „Сілы“, „Міны“ і „Ільліча“, правільней—трэба аб'яднаць гэтыя тры гаспадаркі, прырэзаць зямлі, аддаць ім крахмальны завод і ўтварыць умовы для жыцьця цьвёрдым піянэрам і будаўнікам сацыялізму.

Ці можна аб'яднаць гэтыя тры гаспадаркі, ці дазваляе зямельная плошча і ці згодны на гата калгасьнікі? Цьвёрдыя калгасьнікі „Сілы“ і „Міны“—піанэры калгаснага будаўніцтва, імкнуцца да буйнай аграмаджанай гаспадаркі, а калгасьнікі «Ільліча»—мучанікі яўрэйскай вёскі—пойдуць праз агонь і ваду да лепшага жыцьця.

Вас. Дубовы.

Сябры калгасу «Мудрэц» у чытальні

Прыкладны калгас.

Калектыўная гаспадарка „Чырвоны Кастрычнік“ утварылася з 9 гаспадароў, на плошчы 91,75 гэктара; увайшло 5 бядняцкіх гаспадарак і 4 серадняцкія. У 1928 годзе калектыў да канчатковага афарыленьня меў розныя перашкоды з боку заможнай часткі вёскі.

У 1924 г. праца пашла па-новаму. На агульным сходзе пастаноўлена будаваць агульны хлеў для жывёлы, абагуліць жывёлу, правесьці кантрактацыю. Цяпер гэта пастанова ажыцьцяўляецца.

Сяляне суседняй вёскі, убачыўшы карысьць калектыўнай апрацоўкі зямлі, пагаварваюць аб тым, каб падаць заявы аб уваходзе ў калектыў.

Перашкоды былі з боку лясьніцтва, апошняе не адпусьціла патрэбнай колькасьці лесаматар'ялаў.

Райвыканкому неабходна больш аддаць увагі калектыву і яго пашырэньню.

Падарожны.

Першыя цаглінкі закладзены.

(В. Раўнапольле, Сьмілавіцкі р., Меншчына).

12 бядняцкіх гаспадарак пастанавілі аб'яднацца ў адну буйную калектыўную гаспадарку.

Яны сустрэлі перашкоды з боку заможнікаў вёскі, але, ня гледзячы на гэта, свае 40 невялікіх палосак яны пажадалі аб'яднаць у калектыў.

Зараз беднота разам з сераднякамі чакае, калі прыедзе каморнік разьбіваць цераспалосіцу—трохпалёўку.

Калгасаўцам адпускаюць бясплатна лес на пабудову будынкаў. Сельсавет павінен зараз паклапаціцца аб уцягненьні большага ліку гаспадароў у калектыў, бо жаданьне ў сялян ёсьць.

М. Людчык.

Калгас „Мудрэц“.

(В. Баршчоўка, Гомельскай акр.).

Як першая ластаўка, зьявілася ў нас калектыўная гаспадарка «Мудрэц». Зьявілася раптам, шмат для каго нечакана.

Дзесяткамі год працавалі сяляне пасобку, а тут—на табе! Ня дзе-небудзь, далёка, а ў межах Баршчоўкі ідуць на злом старыя звычаі, калектыў пачынае пушчаць свае карэньні, і беднота ў гэтай справе задае тон.

«Мудрэц» расьце. За кароткі тэрмін пабудавалі жылы дом, вялізарную адрыню; сваімі жалезнымі дахамі гэтыя будынкі прыцягваюць мімаволі ўзрок кожнага, хто ідзе праз калектыў. А зірнуў-бы хто ў сярэдзіну адрыны—якіх добрых кароў убачыў-бы ён. Іншаму сябру калектыўнай гаспадаркі мо' і ня сьнілася ніколі, што ён будзе даглядаць такую жывёлу. Іх ужо 34 штукі, ёсьць два бугаі сымэнталы, кнур—ёркшыр, сямёра рабочых коняй і жарабок.

А ў часе арганізацыі калгасу ўсе пяць сем'яў прывялі ўсяго чатыры каровы і старога каня.

З каго склаўся першы калектыў?

Пачын у гэтай справе належыць кандыдату партыі незаможніку Атроху Несьцераву. Тры такія-ж небаракі і два батракі—вось тыя хто адгукнуўся на заклік Несьцерава.

Зараз лік гаспадароў, уступіўшых у калгас „Мудрэц“, узрос да дзевяці, з 38 едакамі. Пры земляўпарадкаваньні калгасу вызначана 13 гэктараў раллі, 37 гэкт. сенажаці і сад на 8 гэкт.—980 плодовых дрэў.

У бягучым годзе мяркуецца пашырыць склад калгасу 10 сем'ямі, зямля якіх пайдзе на пашырэньне пасяўной плошчы калгасу. Ужо ёсьць 18 заяў. Селета ўся зямля своечасова засеяна ачышчаным насеньнем.

Увосень 28 году 3 гэкт. засеяны пяткускім жытам, якое пасьля ўраджаю, згодна пастановы агульнага сходу, будзе перадана с.-гасп. т-ву дзеля размеркаваньня на насеньне незаможным сялянам.

У якасьці ўгнаеньня, акрамя гною, выкарыстана 20 пудоў попелу і 105 пудоў суперфасфату.

Мёртвым інвэнтаром калгас забясьпечан у поўнай меры.

Сад даглядзе жывёла знаходзіцца пад сталым дглядам кантроль-асыстэнта. Малако, якое застаецца пасьля здавальненьня сяброў калгасу, накіроўваецца ў маслароблую арцель. Праз сэпаратар штодня калектыў перапускае 100-120 клг. малака.

У часе падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы калгас адпускаў мёртвы інвэнтар сялянству (беднякам) бясплатна.

На інвэнтар, жывёлу і будынкі калгас атрымаў доўгатэрміновы крэдыт. Крыніцай прыбытку зьяўляецца ў даны момант дастаўка тавараў у спажывецкае т-ва.

Інструкцыйнае кіраўніцтва дае Калгассаюз, але трэба адзначыць, што патрэбны найбольш уважлівыя адносіны вышэйшых установ да маладой калектыўнай гаспадаркі, якая толькі пачынае жыць па-новаму.

Культпраца наладжваецца. Выпісваюцца газэты і часопісі. Дзеля сяброў калгасу і вакольчых сялян адбываецца чытка газэт і праводзяцца гутаркі. Пяцісьменных (а іх у калгасе 9 чалавек) мяркуецца ў паступным навучальным годзе накіраваць у лікпункт.

Узаемаадносіны паміж сябрамі калгасу добрыя, таксама і з вясковым насельніцтвам.

У будучым мяркуецца дадаць 10 галоў рагатай жывёлы, зьмяніць пару коняй, пабудаваць новы дом на 4 кватэры і лазьню. Далей плянам прадугледжаны паравы млын, маслабойка, а таксама суконвальня.

Дробныя сялянскія гаспадаркі не карысны, а да калектывізацыі шлях адчынен земляўпарадкаваньнем, і ўжо зараз пасялкоўцы пачынаюць гутаркі аб тым, каб найсьці за першым калгасам, які паказаў добры прыклад.

М. Альбіцкі.

У САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ ПАХОДЗЕ.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПАВІННА ПАЛЕПШЫЦЬ ПРАЦУ ЎСТАНОЎ, САБРАЦЬ СРОДКІ НА САМАЛЁТ „БЯЗБОЖНІК“, ПАДНЯЦЬ ПАДПІСКУ НА ГАЗЭТУ „БЯЗБОЖНІК“, АДМЯНІЦЬ РЭЛІГІЙНЫЯ СЬВЯТЫ—ВОСЬ ЗАДАЧЫ СПАБОРНІЦТВА БЯЗБОЖНІКАЎ.

Працу Гарсавету—на прадпрыёмствы.

Сэкцыя працы і сацыяльнай забясьпекі Віцебскага гарадзкога савету ўступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва. Умовы спаборніцтва наступныя:

75 проц. сваіх пленумаў—праводзіць непасрэдна на прадпрыёмствах, 100 проц. яўка на пленумы гарсавету, сэкцыі, камісіі і актыўны ўдзел у працы гарсавету; барацьба з бюракратызмам, валакітай на прадпрыёмстве; калектыўнае хаваньне аблігацый пазыкі індустрыялізацыі; кожныя 3 месяцы рабіць справаздачы перад выбаршчыкамі; актыўны ўдзел на прадпрыёмстве ў працы вытворчых і эканамічных нарад; даручэньні гарсавету праводзіць не за кошт рабочага часу. Кожны член гарсавету абавязваецца выпісаць адну з 4-х газэт: „Известия ЦИК СССР“, «Савецкую Беларусь», „Зарю Запада“, або «Зьвязду».

Сэкцыя працы выклікала на спаборніцтва камунальную, падаткова-фінансавую, вайсковую і каапэрацыйную сэкцыю.

Н. Дворсон.

Уступілі і выклікаюць.

Працаўнікі народных судоў г. Менску ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва; яны заключылі паміж сабою дагавор, па якім абавязваюцца: разглядаць паступаючыя справы не пазьней 2-х тыдняў пасьля паступленьня; разгрузіць варсуды ад спраў; своечасова адчыняць судовыя пасяджэньні; прымаць раз у тыдзень наведвальнікаў па вечарох у парадку грамадзкай нагрузкі; рабіць справаздачы аб працы судоў на рабочых сходах.

Акрамя гэтага, калектыў менскага акруговага суду і варсудоў выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва калектыў віцебскага аирсуду.

Спадзяёмся, што гэтыя ўмовы дагавору будуць выкананы поўнасьцю.

А. Пусіп.

Мазырскія паштавікі выклікаюць полацкіх.

Агульны сход працаўнікоў мазырскай паштова-тэлеграфнай канторы зрабіў выклік полацкай паштова-тэлеграфнай канторы на сацыялістычнае спаборніцтва. Асноўная мэта спаборніцтва:

У кароткі тэрмін дабіцца узорнай працоўнай дысцыпліны, зьмыць самаўласныя адлучкі ў час працы.

Дабіцца, каб водпуск кліентаў не перавышаў 2-3 хвілін у сярэднім па ўсіх галінах паштовай вытворчасьці, прыёму тэлеграм і даручэньняў.

Падняць вытворчасьць працы на 15 пр.

Згодна пастановы полацкіх паштовых працаўнікоў на ўступленьне ў сацыялістычнае спаборніцтва ўжо атрымана і на гэтых днёх адбудзецца ўрачыстае падпісаньне дагавору.

Є. Гутман.

Хата-чытальня выклікала нардом.

(Крайскі с.-с., Плешчаніцкі. р.).

24-га чэрвеня пры Крайскай хаце-чытальні адбыўся сход актыву хаты-чытальні пры значным удзеле насельніцтва.

Заслухаўшы даклад аб сацыялістычным спаборніцтве, агульны сход вынес пастанову прыняць удзел у ім.

Крайская хата-чытальня выклікае Плешчаніцкі нардом і Каменскую хату-чытальню (Плешчаніцкага раёну) у спаборніцтва па наступных галінах: аграпрапаганда і калектывізацыя вёскі, антырэлігійная прапаганда, праца Асавіяхіму і арганізацыя Чырвонага Крыжу.

Н.

Рабселькоры ў спабоонiцтве.

(Полаччына).

Рабселькоры выступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва пад лёзунгамі: прасунем наш друк у гушчы працоўнага насельніцтва, разгорнем грамадзкую працу і дапаможам партыі правесьці ў жыцьцё важнейшыя чарговыя задачы.

Селькор Буржаўскі (Асьвейшчына), распаўсюдзіў некалькі дзесяткаў „Крестьянской Газеты“, „Савецкай Беларусі“, „Чырвонай Полаччыны“ і іншых газэт.

Селькоры Скарновіч Янка і Васільеў Пілип (Расоншчына) пасьпяхова вярбуюць падпісчыкаў на „Савецкую Беларусь“ і на „Чырвоную Полаччыну“.

Рабкоры Фрыдко, Саўчапка, Рэйнгальд, Шах—завярбавалі больш 100 падпісчыкаў на розныя газэты і часопісі.

Мы выклікаем на спаборніцтва ў гэтай галіне рабселькораў Бабруйшчыны, Віцебшчыны, Гомельшчыны і Магілеўшчыны.

Зьпір. Міх.

Спаборніцтва зьнішчыць п'янкі.

(В. Урэчча, Слуцкага раёну).

Пры нашай хаце-чытальні складзена ўдарная камісія па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Камісія выпрацавала канкрэтны плян, якім мяркуецца ўцягнуць у сацыялістычнае спаборніцтва ўсе грамадзкія і каапэрацыйныя арганізацыі, а таксама ўсе вёскі, установы і прамысловасьць нашага сельсавету.

Падрыхтоўчая праца ўжо пачалася. Быў склікан масавы сход усіх прафсаюзаў, дзе шырока абгаварвалася пытаньне сацыялістычнага спаборніцтва.

Рабочыя гаварылі, што спаборніцтва паложыць канец прагулам і п'янкам, (якія маюць месца на нашых заводах), узьніме прадукцыйнасьць працы.

Усе сілы камісіі і актыву накіраваны на вёску, каб уцягнуць яе ў спаборніцтва.

Дубовік.

Выканаць рашэньні па дарожнаму будаўніцтву,

(Магілёў).

Вытворчая камісія пры акруговым дарожным аддзеле 4-га чэрвеня склікала вытворчую нараду працаўнікоў па дарожнаму будаўніцтву, на якой прысутнічала каля 46 асоб. На абгаварэньні гэтай нарады было ўвесена пытаньне сацыялістычнага спаборніцтва на шляхаваму будаўніцтву

Пастаноўлена: тэрмінова прапрацаваць плян правядзеньня сацыялістычнага спаборніцтва на аддзелу, высунуць канкрэтныя аб'екты працы па спаборніцтву. Камісіі даручана таксама прапрацаваць плян па сацыялістычнаму спаборніцтву з суседняй акругай.

Трэба адзначыць, што гэта пастанова прапрацавана толькі праз 16 дзён пасьля вытворчай нарады, што ненармальна.

Намечана правесьці спаборніцтва па лінейнай службе на наступных умовах: палепшыць якасьць работ, менш затрачваць часу, зьнізіць кошт работ, рацыянальна скарыстоўваць будаўнічыя матар'ялы, падвысіць працоўную дысцыпліну.

Падарожны.

Бязбожнікі ў спаборніцтве.

(Мазыр).

Заключана ўмова аб уступленьні ў сацыялістычнае спаборніцтва паміж Нараўлянскай местачковай і Пятрыкоўскай гарадзкой ячэйкамі саюзу бязбожнікаў

Нараўлянская ячэйка абавязуецца да 1-га студзеня 1930 г. правесьці наступнае: сабрать на самалёт «Бязбожнік» 75 руб.; склад ячэйкі павялічыць да 100 чал.; павялічыць падпіску на газэту „Бязбожнік“ да 40 экз. Дабіцца пералому дню адпачынку па ўсіх яўрэйскіх арцелях і калгасах з суботы на іншы дзень; дабіцца адмены яўрэйскіх сьвят; правесьці трохтыднёвыя антырэлігійныя курсы райёну на 8 чал. за сродкі ячэйкі.

Пятрыкоўская ячэйка абавязуецца правесьці працу аб перадачы 2-х сінагог пад культурныя ўстановы, дабіцца адмены яўрэйскіх сьвят у яўрэйскіх арцелях.

Гэткія формы спаборніцтва неабходна ўжыць і ў іншых ячэйках саюзу бязбожнікаў акругі.

М. Г-н.

Там, дзе моцна сьпяць.

(Менск).

Сацыялістычнае спаборніцтва ў поўным разгары. У некаторых мясцох ёсьць ужо значныя дасягненьні.

Але мы маем і такія месцы, куды яно яшчэ зусім не прасякла. Гэткім месцам зьяўляецца калегія абаронцаў, якая з пераходам на калектыўны мэтад працы павінна больш зьвязацца з грамадзкасьцю і больш актыўна рэагаваць на палітычныя кампаніі.

Разгарнуць спаборніцтва можна тут у такім напрамку: арганізацыя і выданьне насьценных газэт, вячэрняе абслугоўваньне наведвальнікаў, павялічэньне выездаў кансультацый у вайсковыя часткі і на прадпрыёмствы, максымальнае абслугоўваньне наведвальнікаў, шэфства над Чырвонай арміяй і вёскай, навучаньне моладзі, якая замацавана для стажорства і г. д.

Калегія абаронцаў павінна ўзяцца за падрыхтоўку гэтага важнага пытаньня і за ўцягненьне ў сацыялістычнае спаборніцтва ўсіх калегій абаронцаў Беларусі.

А. П-с-п.

У спаборніцтве—ні кроку

(Магілеўская акруга).

На ўсім Савецкім Саюзе ідзе шпаркім тэмпам сацыялістычнае спаборніцтва. Але ў нашым Чачэвіцкім раёне хвалі спаборніцтва не знашлі пакульшто сабе месца. Гэта таму, што па пытаньню сацыялістычнага спаборніцтва не праведзена растлумачыцельная праца

Трэба ўрэшце раскачацца чачэвіцкім працаўнікам і зрабіць усё магчымае па ўцягненьню працоўных раёну ў сацыялістычнае спаборніцтва.

Я. Кр.

Мая прапанова.

(Падгайскі сельсавет, Самахвалавіцкага р.)

У нашым сельсавеце закончылася растлумачальная кампанія аб дарожнай павіннасьці. У ліпені м-цы гэтая павіннасьць мусіць быць ажыцьцёўлена хоць часткова, а таму ў сучасны момант было-б якраз мэтазгодна правесьці гэтую кампанію пад лёзунгам сацыялістычнага спаборніцтва на вёсцы, тым больш, што праца па дарожнай павіннасьці будзе адбывацца зьдзельна паасобнымі калектыўнымі групамі або вёскамі.

М. Русаловіч.

Птушніцтва ў БССР і шляхі палепшаньня яго.

Птушніцтва ў СССР мае ўсе падставы для свайго разьвіцьця. Так, па даных замежнага гандлю, экспарт прадуктаў птушніцтва ў 1913 годзе займаў трэцяе месца сярод экспарту іншых прадуктаў сельскае гаспадаркі. У 1913 годзе было экспартавана: збожжа—на 594,5 млн. руб., лесаматар'ялаў—на 164,9 млн. руб., прадуктаў птушніцтва—на 108,4 млн. р., лёну—на 86,8 млн. руб., масла кароўага—на 71,5 млн.руб.

З прадуктаў птушніцтва больш усяго экспартавалася за межы яек: у 1913 г. іх было вывезена на суму 90,6 млн. р.

Экспарт яек у вывазе прадуктаў жывёлаводзтва займаў першае месца. У сусьветным грузазвароце па яечнаму гандлю даваенная Расея стаяла на першым месцы, займаючы ў сусьветным экспарце яек за 1913 г. 44 проц.

У БССР экспарт яек і іншых прадуктаў птушніцтва ў 1911—13 г. быў на 7-м месцы сярод сельска-гаспадарчага экспарту і дасягаў 456 тыс.руб., ці 2,5 проц. усяго сельска-гаспадарчага экспарту, у той час, калі вываз прадуктаў птушніцтва з усяе Расеі за тыя-ж гады быў 6,9 проц. Гады грамадзянскай вайны і акупацыі адбіліся як на колькасным зьніжэньні птушніцтва, так і на яго таварнасьці. Згодна даных Наркамгандлю, у 1924-25 годзе было загатоўлена толькі 484,7 скрынак яек.

Загатоўкі ў далейшым пачынаюць значна пашырацца і даюць наступныя лічбы: у 1925-26 г. загатоўлена 5337 скрынак, у 1926-27 г.—6557 скрынак, у 1927-28 г.—15594 скрынкі і ў 1928-29 годзе мяркуецца загатовіць 20.000 скрынак. У 1927-28 годзе за межы СССР было адпраўлена 5257 скрынак, у 1928-29 г. мяркуецца экспартаваць 8.000.

Ня гледзячы на рост загатовак за апошнія гады, ахоп таварнай часткі яечнай прадукцыі вельмі нязначны: ў 1927-28 г. ён складаў 37 проц. таварнай прадукцыі, у 1928-29 годзе мяркуецца ахапіць рынак на 45 проц.

Трэба раз назаўсёды адкінуць погляд на птушніцтва, як на нікчэмную—„баб'ю“ справу, а заняцца ім сур'ёзна. Пры правільнай пастаноўцы справы птушніцтва зьявіцца адной з прыбытковых галін сельскае гаспадаркі. Асноўнай прычынай адсталасьці птушніцтва зьяўлецца неарганізаванасьць збыту прадукцыі птушніцтва.

На яечным рынку яшчэ да гэтага часу пануе прыватнік, які не даплачвае сялянству за яго прадукцыю. Захоўваньне яек насельніцтвам, зьбіраньне іх загатоўчымі арганізацыямі, упакоўка і сартаваньне пастаўлены дрэнна, у выніку чаго на замежным рынку мы не атрымліваем за іх тое, што павінны атрымаць. У даваенны час, напрыклад, расейскія яйкі на замежным рынку цаніліся ў 1½ разы таньней, чымся дацкія.

Таксама дрэнна абстаіць справа і са збытам птушак. Амаль што ўся птушка ішла за межы ў жывым выглядзе. Для адкорму гэтай птушкі ішоў за межы і наш корм, а адтуль мы атрымлівалі пяро і пух па высокіх цэнах і на ўсім гэтым, зразумела, мы мелі вялікія страты.

Неабходна сельска-гаспадарчай каапэрацыі ўзяць на сябе арганізацыю рынку прадуктаў птушніцтва праз каапэраваньне сялян у спэцыяльныя птушніцкія таварыствы. Да гэтага часу ўдзельная вага сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў загатоўчых апэрацыях была вельмі нязначная. Так, у 1927-28 г. яна раўнялася 9,8 проц. агульнага загатоўчага пляну.

Першачарговай задачай птушніцкіх таварыстваў будзе загатоўка яек і птушкі. Праца павінна быць пастаўлена належна, каб усе апэрацыі таварыства магчыма было апраўдаць з камэрцыйнага боку.

У таварыства неабходна ўцягнуць бядняцка-серадняцкую масу вёскі, асабліва жанчын дзеля таго, што гэта галіна сельскай гаспадаркі зьяўляецца, галоўным чынам, бядняцка-серадняцкіх груп і больш падпарадкавана ў гаспадарцы жанчыне-сялянцы.

Апошняе пацьвярджаецца данымі сялянскіх бюджэтаў, а ўласна; у гаспадарках, якія маюць зямлі да 2,09 дзес., вылавы прыбытак ад птушніцтва і пчалярства ў 1924-25 г. складаў 5,55 руб., ад 2,10—4,09 дз.—9,22 руб., ад 4,10—6,09 дзес.—12,08 руб.; ад 8,10—10,09 дзес.—25,92 руб.; ад 10,10—16,09 дзес.—24,42 руб.

Рыначны зварот па 1 гаспадарку ў 1924-25 г. быў: гаспадарка да 2,09 д. зямлі прадала і абмяняла прадуктаў птушніцтва на 2,56 руб., ад 4,1—6,09 дзес.—на 3,41 руб., ад 8—16,09 дзес. -да 5,03 руб.

У 1928-29 годзе мяркуецца мець 34 раённыя птушніцкія таварыствы ў больш моцных па таварнасьці раёнах, а ў працягу бліжэйшых трох гадоў—ахапіць арганізацыяй гэткіх таварыстваў усе раёны БССР. У працу па загатоўцы яек птушніцкімі таварыствамі павінен быць уцягнуты значочы актыў р-ну, якіх дзеля азнаямленьня з тэхнікай зьбіраньня яек неабходна прапусьціць праз спэцыяльныя кароткатэрміновыя курсы.

Палепшаньне мясцовай птушкі, падвышэньне яе яйканоснасьці і мяснасьці будзе праводзіцца праз мэтызацыю яе з гатункавай птушкай.

Выпісваньне гатункавай птушкі з-за мяжы і разьмяшчэньне яе непасрэдна ў сялянскіх гаспадарках немэтазгодна. Вопыт мінулых гадоў працы паказаў, што каштоўны племянны матар'ял у большасьці выпадкаў гіне ад дрэнных умоў утрыманьня і догляду. Дзеля гэтага мяркуецца стаць на шлях утварэньня свайго акліматызаванага матар'ялу на базе племяннога ядра, выпісанага з-за мяжы для птушніцкіх заводаў. Племянная праца па птушніцтву будзе сканцэнтравана ў працягу 5-цігодзьдзя ў 4 гаспадарках Бельсельтрэсту з матачным ядром у кожнай: курэй—1.000 галоў і гусей—400 галоў. Акрамя 4 заводаў, якія будуць арганізаваны па лініі НКЗ, прадугледжвае арганізаваць 8 птушніцкіх гаспадарак Дзяржгадаль.

Выпуск племянной прадукцыі ў год разьлічваецца пры поўным штаце племянной птушкі на кожным заводзе наступны: племянных яек: — каля 38.000 шт., маладняка 6 мес. узросту—3500 гал. Множнікамі племянной птушкі асноўнымі разьмеркавацелямі яе сярод насельніцтва будуць калгасы, у якіх будуць арганізаваны рассаднікі на 100 галоў племянной птушкі (курэй) кожны. У 1928-29 г. такіх рассаднікаў будзе арганізавана — 150, а ў працягу 5-цігодзьдзя—350. Дзеля таго, што асноўнай мэтай рассаднікаў у калгасах будзе павялічэньне колькасьці племянной птушкі і дастаўка яе ў першую чаргу ў птушныя таварыствы, арганізацыя іх павінна быць увязана з райёнамі дзейнасьці таварыстваў. Праца таварыстваў па палепшаньні сялянскай птушкі будзе праводзіцца праз мэтызацыю яе раздачай племянных пеўняў цэлым вёскам, раздачы каапэраванаму насельніцтву племяных гнёзд дарослай птушкі, прадажы племянных яек і куранят.

Правядзеньне ўсіх вышэйпаказаных мерапрыёмстваў на птушніцтву дадуць магчымасьць значна пашырыць нашы экспартныя магчымасьці і зробяць птушніцтва аднэй з самых прыбытковых галін сельскай гаспадаркі.

Але адначасова з гэтым неабходна адзначыць, што ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыёмстваў і вынікі ад іх будуць толькі тады, калі птушніцтва на мясцох будзе абслугоўвацца і інструктавацца спэцыяльным пэрсаналам, чаго ў нас да гэтага часу няма. Пытаньне аб падрыхтоўцы кадраў спэцыялістаў для працы па птушніцтву ў сыстэме сельска-гаспадарчай каапэрацыі і аморганаў зьяўляецца самым актуальным. Неабходна зьвярнуць увагу на пашырэньне выкладаньня птушніцтва як у ВУЗ'ах, так і ў сярэдніх і ніжэйшых сельска-гаспадарчых школах, каб агромны-зоотэхнікі былі больш падрыхтаванымі як у арганізацыйных пытаньнях птушніцтва, так і ў сэнсе тэхнікі вядзеньня самой справы.

М. Канавальчык.

ЧЫСТКА САВЕЦКАГА АПАРАТУ.

Чыстка органаў акрсуду і акрпракуратуры.

8-га ліпеня ў клюбе чыгуначнікоў імя Ільліча адбыўся першы сход па чыстцы органаў Менакрсуду і акрпракуратуры.

Работа па чыстцы распачалася з дакладаў аб дзейнасьці акрсуду, акрпракуратуры і садакладаў прадстаўнікоў камісій, якія праводзілі праверку працы гэтых устаноў.

Мала мець у апараце працаздольных, сумленных, адданых савецкай уладзе працаўнікоў,—трэба стварыць яшчэ адпаведныя ўмовы для працы, забясьпечыўшы, належна працаўнікоў судовых устаноў. Тым часам працаўнікі судовых устаноў зараз забясьпечаны вельмі слаба. Напрыклад, судовыя выканаўцы атрымліваюць толькі па 45 руб. у месяц. Гэта, бязумоўна, адбіваецца на якасьці іх працы. Судовыя выканаўцы атрымліваюць яшчэ некаторыя проценты ад спагнаньня грашовых сум. Чым большыя гэтыя сумы, тым большыя проценты яны атрымліваюць. І зусім слушна, што,ганяючыся за большымі процантамі, судовыя выканаўцы зварачваюць менш увагі на спагнаньне больш дробных сум, на долю якіх пераважна прыпадаюць алімэнты. Бываюць выпадкі, што алімэнты спагняюць у працягу 2-х год.

Другое балючае пытаньне—гэта справа з вылучэньнем рабочых у судовы апарат. Ні для каго не сакрэт, што арабочваньне судовага апарату праходзіць вельмі марудна і гэта таму, што рабочы матар'яльна губляе на гэтым вылучэньні, бо на прадпрыемстве ён больш можа атрымаць, чым у судовых органах.

І зусім меў рацыю рабочы-чыгуначнік т. Савіцкі, які падносіць толькі каменьні ці цэглу, атрымлівае больш, чым судовы выканаўца. Але-ж тут справа ня толькі ў адных судовых выканаўцах. Ня лепш справа абстаіць з народным судзьдзёй, які атрымлівае 75 руб. у месяц. Кваліфікаваны рабочы не згадзіўся-б пайсьці працаваць судзьдзёй за такі аклад.

* * *

Акрсуд, акрпракутара, сьледчыя органы і нарсуды маюць у апошнія часы значныя дасягненьні ў сваёй працы. Загружанасьць судоў значна скарацілася; палепшыўся асабовы склад судоў і пракуратуры. Але ёсьць яшчэ і хібы ў працы; мы сустракаемся яшчэ часам з праявамі валакіты, калі судовыя справы адкладваюцца на некалькі разоў. Трэба сказаць зусім шчыра, што наш суд яшчэ мала набліжаны да мас, нашы суды мала робіць справаздач на цырокіх рабочых сходах. Праўда, акрсуд выступае са справаздачай аб сваёй дзейнасьці на пленумах гарсавету, на пасяджэньнях праўнай сэкцыі гарсавету, але гэта аудыторыя надта адмежаваная; працу нашых судоў трэба вынесьці на абмеркаваньне шырокіх колаў працоўных, трэба бліжэй пазнаёміць рабочых і селян з папраўчай палітыкай савецкага суду.

Але вернемся да таго, што перашкаджае працы судоў. Сюды трэба залічыць нядбайныя адносіны да вывучэньня судовага матар'яду. Часта бывае, што судзьдзя прышоўшы на суд, з большага пазнаёміцца са справаю, не ўваходзячы ў сутнасьць яе. Вынікам такога „азнаямленьня" бывае тое, што справа адкладваецца па некалькі разоў, Вінаваты ў гэтым бываюць таксама і юрыдычныя кансультацыі, якія пішуць заявы, не ўваходзячы падрабязна ў тое, ці патрэбны сьведка.

Старшыня акрсуду т. Жылінскі дэманстраваў на прыкладах, як часам судзьдзі фармулююць прысуды так, што нават высока-разьвітаму чалавеку цяжка ўцяміць, аб чым тут гаворыцца. Бываюць выпадкі нячулых адносін, няўменьне кваліфікаваць ступень віноўнасьці. Напрыклад, адзін судзьдзя прысудзіў селяніна за параненьне чужой сьвіньні, якая забралася да яго ў гарод, да 3-х месяцаў зьняволеньня, у той час, як за такі барбарскі ўчынак, як сумыснае папсаваньне языка каню, судзьдзь таксама на 3-4 месяцы адмежаваньня. Гэта сьведчыць аб тым, што судзьдзям павярхоўна адносіцца да сваіх абавязкаў.

Сустракаюцца таксама выпадкі, калі прысуды выносяцца праз доўгі час, пасьля судовага пасяджэньня. Быў факт, што ў адным нарсудзе згубілі прысуд. У выніку гэтага апраўданыя асобы, але пазбаўленыя волі, павінны былі дарэмна сядзець па 3-4 дні ў папраўчым доме.

Нашы суды мала зварачваюць увагі на бытавыя дробязі: хуліганства, пабоі, сварку. Тым часам такія факты ў нашым быце адыгрываюць вялікую ролю. Часта яны робяць жыцьцё немагчымым, а суды спыняюць такія справы, лічачы іх вельмі дробнымі.

Тав. Прэабражэнскі ў сваім выступленьні адзначыў, што праз суд часта выкрываецца псэўданім карэспандэнта. Гэтага не павінне быць. У тых выпадках, калі карэспандэнцы не пацьвярджаюцца, газэты павінны рэабілітаваць тых асоб, аб якіх пісалася.

———

Крытыка судовых органаў і пракуратуры разьвярнулася ва ўсю шырыню. Крытыкавалі ўсе: рабочыя, адміністрацыя тэхнпрацаўнікі, кур'еры, прыбіральшчыцы. Ніхто не хаваў і не замазваў хібаў і недахопаў у працы. Ня гледзячы на тое, што гадзіньнік паказваў блізка гадзіну ночы, публіка і ня думала разыходзіцца.

Асабовая чыстка апарату адбудзецца ў наступнае пасяджэньне камісіі.

Ці можна пакідаць яго на працы?

(Каралінскі р-н, Мазыршчына).

У Каралінскім РВК працуе бухгальтарам пехта Наўроцкі Э. сын былога кіраўніка маёнтку. Тое, што ён сын кіраўніка маёнтку, нічога ня значыць, калі-б ён працаваў як сьлед, але бяда ў тым, што Наўроцкі ўжо два гады зьяўляецца кіраўніком Каралінскага РВК. Калі старшыня РВК распарадзіцца выдаць каму небудзь грошы, то гэта ня значыць, што іх можна атрымаць. Наўроцкі знойдзе прычыну іх ня выдаць.

Калі настаўнік паабяцае пазычыць Наўроцкаму дзесятку, то можна грошы атрымаць заўсёды. Наўроцкаму трэба грошы, бо ён будуе сабе добры домік, як кажуць, не па акладу.

Ёсьць за гэтым працаўніком і іншыя грашкі. Антысэміт ён у Ельску першы; сам ён праўда ўстрымліваецца, але другіх нацкоўвае.

На сходзе рабочых і служачых м. Ельск гаварылі аб гэтым працаўніку, але справа далей гаворкі не пайшла, трэба гэтага «працаўніка» вычысьціць, бо ён акрыяя шкоды больш нічога не дае. **Настаўнікі.**

Чыстка апарату павінна зачапіць іх.

Сялянства Дубровенскага р. чакае чысткі апарату савецкіх, каапэрацыйных і іншых устаноў, а разам з гэтым і палепшаньня працы апарату. Вось асобы, якія па нашай думцы павінны быць вычышчыны.

Бычынскі Сідар Іванаў—жыхар в. Карабанавіч—мае добрую гаспадарку, зараз служыць у праўленьні Дубровенскага с.-т. Вядзе шалёную, скрытую барацьбу супроць арганізуемага зараз калгасу ў Карабанавічах, ён разлагае беднату і серадняцтва.

Старавойтаў Касьцюк Яўменаў—жыхар в. Карабанавіч мае добрую ўласную гаспадарку, сын былога валаснога старшыні кулака, зараз служыць загадчыкам крамы ў Сваташыцах, вораг калектывізацыі вёскі.

Лігароў Трахім Панцялеяў жыхар в. Глебава, сын кулака, мае моцную гаспадарку, зараз служыць загадчыкам калгасу Дубровенскага РВК.

Праскураў Хведар Карпаў—жыхар вёскі Негаціна,—мае добрую гаспадарку, зараз служыць лясьніком Сваташыцкага л-ва, у той час як бедняко́ў ня прымаюць.

Вось асобы, аб якіх варта пагаварыць камісіі па частцы апарату дубровенскіх устаноў, бо сялянства выказвае нездаволеньне гэтымі працаўнікамі. **П.**

Ці выпадкова „маленькая" памылка?

Карысная справа—спрашчэньне і скарачэньне канцэлярскае пісаніны. Маеш сабе рознай формы блянкі, у якія ўпісваеш прозьвішча і бяз ніякае затрымкі здавальняеш наведвальніка.

Але ёсьць „простота, которая хуже воровства". Вось якое пасьведчаньне выдаў Магілеўскі райвыканком 16 сакавіка г. г. за № 2222.

„Дадзена гэта Агрэсту Берку Абрамаву, патэнт № 49, у тым, што яму дазваляецца ўтвараць скупку і загатоўку сыравіны і с.-г. прадуктаў у межах сельсаветаў (пералічаны сем сельсаветаў).

Пастанова прэзыдыуму РВК ад 4-II № 3.

Старшыня Жалезны.

Заг. граш.-пад. часткі Сукачоў".

Паперка мае ўсе адзнакі таго, што па гэтай форме выдаваліся пасьведчаньні і іншым асобам.

Калі-ж вы пацікавіцеся патэнтам за № 49, дык убачыце, што патэнт дадзен толькі на права скупкі жывёлы.

Цікава і тое, як райвыканком выкарыстоўвае сваё права і абавязак абмежаваньня дзейнасьці прыватніка паўным райёнам. Замест таго, каб вызначыць 1 альбо 2 сельсаветы, выканком «вялікадушна» дае яму сем.

Вельмі ня шкодзіла-б выявіць, колькі гэткім Агрэстам спрыяў Магілеўскі райвыканком, тым больш, што мы напярэдадні новае загатоўчае кампаніі, да якой ужо ідзе падрыхтоўка.

Квік.

Вынікі чысткі біржы працы.

Як праходзіла чыстка.

З боку беспрацоўных і служачых біржы працы была вялікая зацікаўленасьць чысткаю. Аб гэтым сьведчыць тое, што на кожнае пасяджэньне прыходзіла каля 300-400 чалавек.

Працавала камісія недарма. Яна выкінула шмат такіх, якія лічыліся „беспрацоўнымі", а на справе выявілася зусім адваротнае. Прайшло праз камісію і шмат „былых" людзей, якія былі запісаны ў сэкцыі чорнарабочых. Вось дык „чорнарабочыя": былыя жандары паліцэйскія, нават з „вышэйшых рангаў" людзі.

Цікавы момант у працы камісіі: былі выпадкі, калі беспрацоўны, даведаўшыся аб тым, што праз некаторы час будзе праходзіць чыстка, загадзя зьнімаўся з вучоту, і потым, калі чыстка канчалася, зноў запісваўся на вучот.

Многія на чыстку прыходзілі з усёй сям'ёй, каб „падпамацаваць сваё сацыяльнае становішча".

Былі выпадкі, што ішлі з хадайніцтвамі за сваякоў, былі моманты „кругавой парукі".

З 27 чалавек служачых, якія прайшлі праз камісію,—мяркуецца зьнясць 5 чалавек; аднаму абвешчана вымова, другому—папярэджаньне за дрэнныя адносіны да беспрацоўных і за іншыя „справы".

З 154 чалавек разумовай сэкцыі зьявілася на чыстку толькі... 66 чалавек. Вычышчана з ліку зьявіўшыхся 19 чалавек. Гэта яскрава паказвае твар разумовай сэкцыі: больш трэці вычысьцілі. Астатнія якія не зьявіліся на чыстку,—зьнімаюцца з вучоту мэханічна.

Што паказала чыстка.

Вельмі дрэнна пастаўлен вучот беспрацоўных у сэкцыі чорнарабочых і юнсэкцыі. Вельмі дрэнна таксама справа з вызалами беспрацоўных на працу.

Ёсьць выпадкі пратэкцыянізму.

З боку ўстаноў і прадпрыемстваў нагледаліся выпадкі нипрынцыця на працу тых, каго пасылала біржа, бо апошняя пасылала якраз ня тых, на каго былі імянныя запатрабаваньні. Такія выпадкі былі з радыё-станцыяй, Гандльбудам, пададдзелам грамадзкіх работ Камгасу і інш. Пасылалі на працу такіх асоб, якія ня маюць на гэта ніякага права.

Трэба адзначыць, што сэкцыя працы гарсавету вельмі мала аддае ўвагі Біржы.

Вельмі слаба і амаль зусім ня ўдзельнічаюць у працы Біржы прафсаюзы.

Зусім адсутнічае культурна-асьветная і выхаваўчая праца.

У бібліятэцы мала новай літаратуры.

Шмат працаўнікоў Біржы зусім не падыходзяць для працы Біржы. Працаўнікі Біржы нячула, груба адносяцца да беспрацоўных, шэф нэрвуе апошніх і ўтварае кепскія абставіны на Біржы.

Сярод працаўнікоў сэкцый ёсьць і чужы элемэнт, які, вядома, зараз вычашчан.

Дзякуючы вялікай актыўнасьці і ўдзелу рабочых у працы па чыстцы Біржы чыстка прайшла добра.

Пастановы камісіі.

Камісія лічыць неабходным узьняць хадайніцтва перад Наркампрацы аб удакладненьні правіл прыёму на вучот.

Неабходна ўстанавіць вучот працы сэкцый.

Пры пасылцы на працу Біржа павінна мець на ўвазе сацыяльнае становішча. Таксама Біржа павінна пры гэтым мець на ўвазе і матар'яльнае становішча кожнага.

Камісія лічыць, што тых, якія не жадаюць ісьці на нізка аплачваемыя работы, Біржа абавязана зьнімаць з вучоту.

Камісія пастанавіла катэгарычна забараніць установам і прадпрыемствам пасылаць імянныя запатрабаваньні на беспрацоўных. Апарату Біржы загадна ня выконваць гэткіх запатрабаваньняў.

Камісія лічыць неабходным правесьці перарэгістрацыю ўсіх беспрацоўных, якія лічацца на Біржы.

Л. П.

Пачалася чыстка апарату Расоншчыны.

Полацак, 8-7. Згодна пастановы АКК РСІ з 20 чэрвеня г. г. пачалася чыстка савецкага апарату Расонскага райёну.

Высунутай камісіяй праведзена шэраг сходаў па чыстцы. Сходы далі магчымасьць выявіць як працавалі ўстановы і арганізацыі Расонскага р. Выяўлены моманты п'янкі, растрат з боку нізавых працаўнікоў.

Адчуваецца вялікая актыўнасьць насельніцтва, асабліва з боку беднякоў, сераднякоў і батракоў.

ХРОНІКА

ФІНАНСАВАНЬНЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

Учора калегія Нар. Кам. Земляробства зацьвердзіла пэрспэктыўны плян фінансаваньня сельскай гаспадаркі на 1929-30 г.—на агульную суму каля 80 мілёнаў руб. (супроць сёлетніх 42 міл. руб.), з іх; па саюзнаму бюджэту—5.381.771 руб., па рэспубліканскаму—18.304.452 руб., па мясцоваму — 3.080.952 руб., па лініі крэдытаваньня — каля 34,5 міл. руб. і па лініі фондаў фінансаваньня—каля 19,4 міл. р.

3.254.000 руб.—на асеньнюю сяўбу.

Белсельбанк адпусьціў на правядзеньне асеньняй сяўбы 3254000 руб., з іх: новым калгасам—142000 руб., на наём цягавай сілы ў бядняцкіх гаспадарках—100000 руб., на с.-г. машыны—1600000 руб., на мінэральнае ўгнаеньне—500000 р., на вапнаваньне—270000 руб., на садоўніцтва—250000 руб., на насеннаводзтва—187000 руб., бядняцкім гаспадаркам на набыцьцё насеньня—100000 р. і г. д.

Украінскія фізкультурнікі ў Менску.

Учора ў Менск прыехала з Харкава дэлегацыя украінскіх фізкультурнікаў у складзе 35 асоб. Апроч гэтага, прыяжджае футбольная каманда харкаўскіх чыгуначнікаў, якая ў нядзелю наладзіць таварыскае спатканьне з Менскай зборнай камандай „Дынама".

Дэлегацыя фізкультурнікаў прабудзе ў Менску 5 дзён і будзе ўдзельнічаць у таварыскім спатканьні з фізкультурнікамі г. Менску.

Выстаўка па жывёлаводзтву.

У Грэскім і Капыльскім райёнах, Менскай акругі, будуць сёлета арганізаваны выстаўкі па жывёлаводзтву. У жніўні ў Койданаве арганізуецца выдавка жарабят штучнага аплодзіваньня. Апроч гэтага, у Самахвалавіцкім і Вузьдзенскім райёнах арганізуецца выдавка маладняка чырвонабеларускага гатунку нароў.

Працоўныя Менску сьвяткуюць дзень вызваленьня ад белапалякаў.

Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні БДТ адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне пленуму Менскага гарсавету супольна з членамі ЦК КП(б)Б, ЦКК КП(б)Б, ЦВК, СНК, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, АК КП(б)Б, АКК КП(б)Б, АК КСМ, ЦП Саюзаў, прадстаўнікі кампалітпрыладу вайсковых часьцей, з удзелам рабочых прадпрыемстваў і дэлегатам,—прысьвечаны 9-й гадавіне вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Прыезд дэлегацыі маскоўскіх рабочых.

Сёньня прыяжджае ў Менск дэлегацыя ў складзе 15-ці рабочых буйнейшых маскоўскіх прадпрыемстваў. Дэлегацыя мае пазнаёміцца з яўрэйскімі калгасамі БССР.

55 трактарных калён.

У 1929-30 г. Наркамзем мяркуе арганізаваць у БССР 55 трактарных калён з колькасьцю 490 трактараў (5-10 трактараў на кожную калёну).

Калектывізавана 42 проц.

Ручаеўскі сельсавет, Гомельскай акругі, зьяўляецца прыкладным для ўсёй рэспублікі ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі: дзякуючы добрай працы партыйных ячэек 42 проц. усіх гаспадарак сельскага савету калектывізавана.

Пашырэньне малочнай прамысловасьці.

У 1929-30 г. вызначана зрабіць значнае пашырэньне малочнай прамысловасьці: мяркуецца пабудаваць 26 масларобча-сыраварных заводаў, 54 масларобчых заводаў, 80 саматужных маслазаводаў, 500 зьліваўных пунктаў і адну гарадзкую малочную ў Віцебску. На гэта будаўніцтва Наркамзем адпусьціў 793.000 руб.

Выпуск інструктароў фізкультуры.

У суботу, 13-га ліпеня, ВСФК арганізуе ў Доме Асьветы выпуск цэнтральных курсаў ВСФК.

Усяго будзе выпушчана 45 інструктароў па фізкультуры.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 10-га ЛІПЕНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 проц. залат. выйгр. паз.	4.79	—
2-я 6 проц. выйгр. паз.	5.00	—
Бяспроц. выйгр. пазыка 1926 г.	126.25	128 25
10 проц. дзярж. пазыка 1927 г.	26.19	26.29
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка індустр.	25.57	25.67
3-я сялянск. выйгр. паз. 27г.	5,03	—
Дзярж. паз. Укр. сял. гасп.	10.52	10.56
12 проц. дзярж. унутр. 1927 г.	101.31	—
2-я 6 проц. паз. выйгр.	26.75	26.85
Пазыка індустр.	25.99	26.09
11 проц. дзярж. унутр. пазыка 1928 г.	103.92	103,97
Пазыка 1929 г.	100.19	100.59

Кінофікацыя БССР.

Калегія Наркамасьветы прыняла 5-ці гадовы плян кінофікацыі БССР.

Паводле гэтага пляну, прадугледжваецца выпуск Белдзяржкіно 52 мастацкіх фільмаў. Выпуск кіно-хронікі павялічыцца з 10-ці нумароў у год да 24-х нумароў.

У канцы 5-цігодкі ў Віцебску намячаецца пабудова кіно-фабрыкі, на што будзе адпушчана да 350.000 руб.

Сетка кіно-ўстаноў будзе разгорнута так, каб усе найбольш буйныя насельныя пункты і раёны мелі кіно-тэатры. У Віцебску і Гомелі будуць адчынены курсы на 440 кіно-мэханікаў.

Новыя кіно-тэатры будуць пабудаваны ў Менску, Бэбруйску і Воршы

Усебеларускі вэлёпрабег.

ВСФК ЦСПСБ арганізуюць да 1-га жніўня ўсебеларускі зорны вэлёпрабег, які павінен прайсьці пад лёзунгам папулярызацыі ідэі міжнароднага чырвонага дню. У прабегу прыме ўдзел каля 150 вэлёсыпэдыстаў. Усе вэлёсыпэдысты выедуць з округ, фініш—Менск.

АД КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ АПАРАТУ.

Даводзіцца да ведама ўсіх рабочых, служачых і беспрацоўных, што ў сераду 10-га ліпеня а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Біржы Працы адбудзецца адчынены сход служачых, рабочых і беспрацоўных: будуць абвешчаны вынікі камісіі па чыстцы беспрацоўных і апарату Біржы Працы.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

За каапэрацыю асьветы.

Задачы, якія стаяць перад спажывецкай каапэрацыяй, будуць ажыцьцёўлены пры умовах узьняцьця культурнага ўзроўню працоўных мас. Гэта патрабуе максымальнай увагі ўсёй сыстэмы спажывецкай каапэрацыі БССР да каапэрацыйна-асьветнай працы.

У гэтай справе вялікую ролю адыгрываюць інструктары асьветнікі. У мінулым годзе па ўсёй сыстэме спажывецкай каапэрацыі было 5 інструктароў, сёлета мы маем 21 інструктара-асьветніка па райсаюзах, ЦРК, аддзяленьнях і спажывецкіх таварыствах. Акрамя інструктароў ёсьць яшчэ аргасьветныя камісіі, якія ўсюды абраны, але добра працуючых камісій яшчэ вельмі мала. Гэта тлумачыцца тым, што спажывецкія таварыствы і райсаюзы недастаткова зьвяртаюць увагу на падбор складу камісій і на іх працу.

Яшчэ вельмі слаба пастаўлена справа падвышэньня каапэрацыйнай пісьменнасьці праз гурткі, няма кіраўнікоў гэтых гурткоў, а там дзе яны ёсьць, дык мала падрыхтаваны. Напрыклад, у адным ЦРК кіраўнік гуртка першую сваю гутарку праваўнік гуртка першую сваю гутарку праводзіў, пачынаючы з дэкабрыстаў і сконча́ючы нэпам (1825-1922 г.). За 2 гадзіны ён прайшоў цэлае стагодзьдзе. Можна ўявіць, што за карысьць атрымалі сябры гуртка ад та ой лекцыі. Неабходна бугуртка ад та ой лекцыі. Неабходна паставіць перад НК Асьветы пытаньне аб тым, каб у БССР была вызначана колькасьць школ сялянскай моладзі і сямігодак в каапэрацыйным ухілам, якія павінны будуць рыхтаваць для каапэрацыі працаўнікоў.

Наяўнасьць у апараце спажывецкай каапэрацыі вялікага ліку працаўнікоў з нізкай кваліфікацыяй, неабходнасьць падвышэньня рыхтоўкі з рабочых, беднякоў і батракоў працоўнікоў каапэрацыі прымушае нас вельмі сур'ёзна адносіцца да справы перападрыхтоўкі і падрыхтоўкі праз курсы.

Белкаапсаюзам сёлета праведзана шмат курсаў: ужо праведзены курсы жаночага каапактыву, загадчыкаў сталовых, кніжных працаўнікоў, кіно-працаўнікоў, інструктароў і г. д. Белкаапсаюз зьвяртаў асаблівую увагу на сацыяльна-слухачоў. Гэта дасьць магчымасьць чыўшым курсы заманіць тых, хто будуць вычышчаны з каапэрацыі, пасьля курсы на падрыхтоўцы з батракоў і нікоў. У масавай працы зараз мы недаходзім; мала скарыстоўваюцца кіх формы, масавая праца ў вёсцы чала разьвіваецца толькі ў вёсцы. Неабходна разьвіць яе шырэй. Ужо чыць калгасы, дзе ўзорна паставіцца апэрацыйна-асьветную масавую, скарыстоўваючы мастацкія формы ным з відаў масавай культасьветы, цы зьяўляецца кіно. У сучасным спажывецкая каапэрацыя зьяўляецца поўнай арганізацыяй, якая прыняла пофікацыю вёскі. На 1 лістапада на сыстэме спажывецкай каапэрацыі ло ўсяго 11 перасовак, а на 15 ліпеня ў нас ужо працуе 103 перасовкі.

Для характарыстыкі разгорнутасьці каапэрацыйна-асьветнай працы ўказаць, што ў 1927-28 гаспадарчым на культурна-бытавую працу па сыстэме спажывецкай каапэрацыі ад прыбытку 274,7 тысяч і ў сным парадку—351,1 тыс. руб., 625,8 т. р. супроць 91 тыс. мінулага.

Трэба адзначыць значнае ашчадненьне ў справе выдаткаваньня сродкаў фонду. Але гэтага яшчэ мала. Неабходна дабіцца, каб ва ўсіх спажывецкіх кооператывах былі каштарысы на культасьветную працу. Разам з тым, каб і каб гэтыя сродкі выдаткоўваліся вінна быць зьнішчана бясплатнасьць каапасьветную працу. Разам з тым, працы, кампансейскі характар, і быць добра падрыхтавана. Неабходна праца і адпавядаць бягучым арганізацыйным і гаспадарчым задачам каапэрацыі. У Міжкародны Дзень Каапэрацыі, падводзячы вынікі ўсёй масавай каапэрацыйнай асьветнай працы, мы павінны выказаць усю грамадзкую думку ахвяр ад ... шчыць усе недахопы, якія былі ... часу.

Я. Кр...

БІБЛІАГРАФІЯ.

БІБЛІАТЭКА ШКОЛЬНІКА.

Г. МОРЫС. „ШКОЛА АДВАГІ". Пераклад з расейскае мовы. Беларускае Дз. Выдавецтва. Менск. 1928 г. (старон. 43, цана 8 кап.).

Чырвонаскуры падлетак с. Блакітнае Пяро, адзіны сын у маці—удавы, дзеля розных практычных меркаваньняў дамагаецца правоў дарослага гасцадара і члена вясковае грамады. Спробы яго муства (змаганьне з мядзьведзямі і ваўкамі) і вытрыманасьці (безьліч пакутаў і катаваньняў, якія ён выносіць) — прыводзяць яго, урэшчэ, да жаданае мэты. Кніжка напісана цікава і, магчыма, у бытавых апісаньнях адпавядае сапраўднасьці. Але даць такое апавяданьне без тлумачэньняў без належных уводзін — вельмі неасьцярожна. За гэтыя ўводзіны можна было-б узяць з чытача яшчэ 2 капейкі і тады за 10 капеек атрымалася-б і асалода і бясспрэчная карысьць. Справа ў тым, што грубыя сцэны выпрабаваньня і пакутаў Влакітнага Пяра трэ' было-б больш падрабязна растлумачыць умовамі жыцьця паляўничых племяньняў, якім патрэбны былі найбольш загартаваныя і на спартанскі лад вымуштраваныя людзі.

Быт, звычаі і прырода далёкае краіны паказаны вельмі ўдала. Наогул, кніжка можа быць карыснаю, калі дарослыя людзі некаторыя месцы растлумачаць ш к а л я р у (а н я ш к о л ь н і к у, як піша Бел. Дз. Выдавецтва на сваіх кніжках, бо школьнік —гэта гэта служка ў сынагозе Л. С.) Пераклад зроблен паогул жывою, яскраваю моваю, але з немалым лікам русіцыізмаў, з якіх адзначу ступныя: старэйшы (=правадыр, стар. 5). Вока Савы (стар. 5 і далей. Вавёрчына Вока), Вока Вавёркі (стар. 11 зьмест: макасынаў), вадзяных ... 16—лепш: збанкоў або вадзяніцы ... ды былі буйней (замест: буйнейшы, 17), старэйшын (стр. 31 і далей, правадыроў), зацягнены ў тры, ... шэрагі...скурані (стар. 39, шэрагі ... падобнае да вяцкага фронту, а ... скурах трэ' было-б сказаць; рана) і іншыя няўдалыя выразы: ніколі ... няючы хуткасьці свайго бегу (стар. ... мусіць—ні ў водным моманце, ні ... най хвіліне ці нешта падобнае), ... ва адносіцца да ярасьцяй буры (стар. ... ярасьць ня мае множнага ліку) ...

Гэта кніжка зьяўляецца адным з ... таньнейшых выданьняў нашага Дз. ... і трэ' было-б падумаць аб тым, ... рэнта прадукцыі наблізілася ў гэтым ... се да цыклю „Бібліятэка школьніка". С.

Апавяшчэньне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня ў садзе вялікае гуляньне, сьвячанае 9-цігодзьдзю вызваленьня Беларусі ад белапалякаў (канцэрт, дуэт, кестр, цір і інш.). Пачатак а 7 г. ... Уваход па саюзных кніжках.

Бібліятэка адчынена штодня да ... ня ад 4 да 8 г. ув.

Часова вык. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

БАЛЯНС

Прапойскага райённага камбінату за 1927-28 справаздачны

АКТЫЎ **ПАСЫЎ**

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА Прыватная	СУМА Агульная	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА Прыватная	СУМА Агульная
I. Маемасьць:			I. Капітал:		
1. Будынкі і пабудовы:			1. Статутны	4841—42	
а) будынкі вытворчыя		3776—84	2. Амортызацыйны	3070—96	
2. Абсталяваньне і машыны:			3. Рэзэрвовы	80—81	7993—
а) сілавыя ўстаноўкі	6800—		Усяго		7993—
б) тэхнічныя машыны і абсталяваньне	5749.40	12549—40	II. Фонды:		
3. Інструманты і гасп. інвэнтар		1051—14	1. Фонд палепшаньня дабрабыту раб.		80—
Усяго		17377—38	V. Доўгатэрміновыя крэдыты:		
II. Нескончаныя пабудовы.			1. Пазыкі Белкамунбанку	1017—20	
1. Абсталяваньне 2-й сукнавалкі		349—51	2. Пазыкі пад вэксалі ў Сельбанку	9000 —	10017—
Усяго па групе I-II		17726—89	Усяго		10017—
V. Матар'ялы:			VII. Вэксалі выдадзеныя		1000
1. Сыравіна і грунтоўн. матар.	146—50		IX. Крэдыторы:		
2. Апал	1178—65		1. Рабочыя і служачыя	396—25	
3. Дапаможныя матар'ялы	14—85	1340 —	4. Неаплачаныя падаткі і зборы	158 —	
Усяго на групе V		1340 —	5. Крэдыторы розныя	90 —	644—
IX. Тавары і гатовыя вырабы.		1226—29	Усяго		644—
X. Грашовыя сродкі.			XII. Вынікі:		
1. Каса	47—47		Прыбытак справаздачн. году		3793—
2. Бягучыя рахункі	1287—75	1335—22			
Усяго		1335—22			
XV. Вэксалі да атрыманьня.					
1. Вэксалі ў партфэлі		897—45			
XVI. Падсправаздачныя сумы.					
1. За весаўшчыком		193—90			
XVII. Дэбіторы:					
1. Рабочыя і служачыя	80 —				
2. Пакупшчыкі	448—24				
3. Дэбіторы розныя	281—25	809—49			
Усяго		809—49			
БАЛЯНС		23529—24	БАЛЯНС		23529—

Загадчык камбінату ЯКУБОВІЧ. **Бухгальтар КУРГАН.**

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ

Страты *Прыбыткі*

НАЗВА СТРАТ	Сума	НАЗВА ПРЫБЫТКАЎ	Сума
1) Гандлёвыя выдаткі	28—20	1) Прыбытак ад рэалізацыі тавараў	570—
2) Агульна-адміністрацыйныя выдаткі	1032—55	2) Прыбытак ад выканаўня чужых заказаў	4761—
3) Проц. выплачаныя: па кароткатэрм. крэд. 45-67		3) Проц. атрыманы	441—
па доўгатэрм. 591—96	637—63	4) Выпадковыя прыбыткі	171—
4) Дадатковая амартызацыя маемасьці	456—64		
Разам	2155—02	Разам	5943—
Сальдо: чысты прыбытак	3793—79		
БАЛЯНС	5948—81	БАЛЯНС	5948—

Загадчык камбінату ЯКУБОВІЧ. **Бухгальтар КУРГАН.**

Балано і рахунак прыбыткаў і страт зацьверджаны стала... баланоавай камісіяй пры Магілеўскім Акрфінадзеле і Прэзыдыумам АВК 3-VI—29 г. (пратакол № 3 п. 109).

Інспэктар Маг. АКРФА БАРОЎ...

ТЭАТР — ЦЫРК — КІНО

Цырк.	СЁНЬНЯ — ВЫКЛЮЧНАЯ Ў СЭЗОНЕ ПРАГРАМА З УДЗЕЛАМ НОВА ПРЫБЫЎШЫХ ГАСТРАЛЁРАЎ З прычыны грандыёзнай праграмы пачатак роўна а 9 гад. увечары. ПА ЗАЯЎКАХ ФАБКОМАЎ І МЯСЦКОМАЎ—СКІДКА.
ТЭАТР „ПРАФІНТЭРН"	Гастролі Маскоўскага 1-га рабочага тэатру Пралеткульта Серада, 10 ліпеня **„Малиновое варенье"** у 6 карц. Афінагенава Білеты ў рабкасе і касе тэатру. Пачатак а 8 з палов. гадзіне.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **„Напярэдадні"** Драма ў 6 частках. Пачатак а 7 з пал. гадзіне.
КІНО ПРАЛЕТАРЫ	**„ЗА СЬЦЯНОЮ"** Драма ў 7 частках. Зьвыш праграмы: кіно-хроніка Совкіно № 33.
КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71.	**„КНЯЗЬ ЦЭРАН"** Пачатак сэансу а 9 гадз. 15 хвілін. Каса а 7 гадзіне.
КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА",	АД АЎТОРКА, 9-ГА ЛІПЕНЯ з прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень!!! 2-гі тыдзень!!! **„ХВОІ ГАМОНЯЦЬ"** Вытворчасьць Белдзяржкіно Пач. сэансу роўна а 8 гадз. Каса адчынена ад 6 гадз.

ЗГУБЛЕНЫ

Асабовае пасьведчаньне за № 1135 Ксеневіча В. А., выд. БДВ, кв. 789.

Партбілет № 1104325 Курапаткіна Т. выд Аршанск. Акр. КПБ, кв. 377-п.

Метрычная выпіс Міклін М. Г., выд. Мазырскім загсам, кв. 389-п.

Конская кніжка Шэршаня Н. І., выд. Смалявіцкім РВК, кв, 390-п.

Конская кніжка Лецецкага В., выданая Лошніцкім РВК, кв. 391-п.

Асабовая вайсковая кніжка Колбіка А., О., выд. 4-м Чырвонаснам. палком 2), пашпарт. выданы Барысаўскай Горміліц. кв. 392 п.

Заявая кніжка № 1848 Масько В. А. выданая Цімкавіцкім Спажывецкім таварыствам, кв. 394-п.

Пашпарт Бейденсон П. Л., выд. Менакрміліц., кв. 790.

Лекавая кніжка Ланкіна Г. Х., выданая Менакстраккасай, кв. 791.

Асабовае пасьведчаньне Каждана І. Б., выд. БДВ. кв. 792.

Асабовае пасьведчаньне Пукшанскай М. І., выд. БДВ, кв. 793.

Асабовая карт. Ламака І. Г., выд. Самахвалавіцкім РВК, кв. 794.

Бальнічны лісток, выд. Мазырск. Акр. бальніц., 2) лекавая кніжка, выданая Мазырскай Страхкасай на імя Шпігановіч К., кв. 396-п